БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ВЫДАЕЦЦА З 1921 ГОДА

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

№ 45 (13525)

4 — 10 лістапада 1991 года

Цана 40 кап. (па падпісцы — 20 кап.)



У старажытным Ракаве. Фота Івана ЮДАША.

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ

Каму і як прадавалі рэвалюцыю?
Адказ на гэта пытанне "з нагоды апошняга свята Вялікага Кастрычніка" спрабуе знайсці гісторык Ю.Афонін.

3

Многія нашы чытачы прапануюць памяняць назву штотыднёвіка. Журналіст У.Міхно лічыць, што мяняць сваё аблічча "Чырвонай змене" не да твару.

4

У артыкуле "Заснуць і не прачнуцца" А.Краўчанка расказвае сумную гісторыю пра дзяўчыну, якая ў 20 год спрабавала скончыць самагубствам.

8

Адыходзяць нашы дзяды і бабулі. Пакідаюць нас ціха, непрыкметна. Як жа мы клапоцімся пра іх старасць? На гэту тэму разважае пісьменнік М.Федзюковіч.

9

Да ўвагі прыхільнікаў "Нотнага аркуша" — рэпартаж з фестывалю бардаўскай песні ў Оршы, анатацыі на альбомы беларускіх і замежных выканаўцаў, іншыя матэрыялы.

11—14

Інтэрв'ю з маскоўскім археолагам В.В.Сядовым, змешчанае ў мінулым выпуску "Сумежжа", выклікала цікавасць у нашых чытачоў. Размову на тэму фарміравання беларусаў, як этнасу, працягваюць А.Рогалеў і Г.Шыйка.

19

"Крымінальнае бюро" прапануе чытачам заканчэнне нататак асуджанай жанчыны "Падласць па загаду".

20

СА СВАЁЙ ЗВАНІЦЫ

# КАМУ І ЯК ПРАДАВАЛІ РЭВАЛЮЦЫЮ?

– Вам, бальшавікам, веры няма... Вы рэвалюцыю прадалі...

– Каму?

– А хто яго ведае... Каму яна патрэбная, таму і прадалі...

Гэты "дыспут" махноўца-вартаўніка з палоннымі чырвонаармейцамі з фільма "Служылі два таварышы" сёння сышоў з экрана і вядзецца ўжо не выдуманымі персанажамі, а рэальнымі людзьмі паўсюды, ад парламенцкіх трыбун да грамадскага транспарту, з той толькі розніцай, што раней бальшавікоў абвінавачвалі ў здрадзе рэвалюцыі, а цяпер — за тое, што яны яе здзейснілі.

## Апарат — нам не брат

Кастрычніцкая рэвалюцыя ставіла сваёй мэтай будаванне гэтакага ладу, пры якім кожны працуе на грамадства па меры здольнасцей, а яно задавальняе матэрыяльныя і духоўныя патрэбы кожнага спачатку па працы, а потым і па патрэбнасцях. Гэтыя мэты адпавядалі інтарэсам тых, хто не мее іншых крыніц існавання, акрамя працы па найму, і тых, хто яшчэ ці ўжо не мог працаваць. Акрамя таго, перспектыва канфіскацыі ўласнасці памешчыкаў і капіталістаў і ператварэння яе ў агульнанародны набытак цалкам задавальняла масу дробных уласнікаў, якія ўбачылі ў ёй выратаванне ад разарэння і разлічвалі штосьці-небудзь захапіць пры дзяльбе маёмасці больш багатых канкурэнтаў ці, у крайнім выпадку, атрымаць нейкую "прыбаўку" з "агульнага катла". Падтрымка гэтых сацыяльных слаёў — працаўнікоў па найму, і дробных уласнікаў, якія жылі сваёй працай — і забяспечыла перамогу ў Кастрычніку 1917 г. бальшавікам, праграма якіх найбольш адпавядала іх інтарэсам.

Аднак пасля перамогі бальшавікі апынуліся ў парадаксальным становішчы. Каб рэалізаваць сваю праграму, ім неабходна зацвердзіцца як манапольная кіруючая партыя. Але, каб стаць гэтай партыяй-манапалістам, яны непазбежна ператвараліся ў абаронцаў не рабочага класа і яго саюзнікаў, а "рабоча-сялянскай дзяржавы". Апошняя ж для забеспячэння свайго нармальнага функцыяніравання ўладарна патрабавала ад бальшавікоў мер, якія ўшчамлялі інтарэсы не толькі нейтральных, але і раней падтрымаўшых рэвалюцыю сацыяльных слаёў.

Так, заключэнне Брэсцкага міру диктавалася неабходнасцю выратаваць дзяржаву любой цаной. Але ўступка праціўніку каля 1 млн.кв.км тэрыторыі, выплата 6 млрд. марак кантрыбуцыі, поўная дэмабілізацыя войска і флоту, выкананне іншых рабаўніцкіх патрабаванняў былі расцэнены большасцю насельніцтва акупаваных ворагам рэгіёнаў як здрадніцтва.

Для забеспячэння прадуктамі харчавання гарадскога насельніцтва, амаль двухмільённага дзяржапарату, больш як 5-мільённага войска, міліцэйскіх фарміраванняў, якія налічвалі каля мільёна чалавек, ва ўмовах грамадзянскай вайны не было іншага сродку, акрамя прадразвёрсткі. Гэтакае дармовае адабранне "лішкаў" пасля абвяшчэння "Дэкрэта аб зямлі" ашаламіла сялян. "Здрада рэвалюцыі",— вырашылі яны.

Можна прывесці яшчэ нямала прыкладаў, калі кіраўнікі кампартыі адступаліся ад раней абвешчаных лозунгаў у імя ўмацнення дзяржапарату, імі ж сфарміраванага для ажыццяўлення тых самых лозунгаў. Але прасцей успомніць прызнанне У.І.Леніна ў 1922 г.:"...не нам належыць гэты апарат, а мы належым яму".

Прыхільнікі камандна-бюракратычных метадаў кіравання як толькі канчаткова атрымалі перамогу ў партапараце, спынілі разлічаную на доўгі перыяд новую эканамічную палітыку і ператварылі дзяржаву ў манапольнага работадаўцу і размеркавальніка матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, усе сацыяльныя слаі насельніцтва трапілі ў эканамічную залежнасць ад яго. Улада аб'яднанага партыйна-дзяржаўнага апарату стала ўсёабдымнай.

Пакуль патрабаванні "нізоў" "вярхі" пацвярджалі палягчэннем умоў працы, павышэннем рэальнай заработнай платы, пашырэннем сеткі бясплатных вучэбных, медыцынскіх устаноў, іншымі сацыяльна-эканамічнымі мерапрыемствамі па павышэнню жыццёвага ўзроўню насельніцтва, існавала рэальнае, а не выдуманае яднанне партыі і народа. Натуральнымі былі і масавы працоўны энтузіязм пры выкананні народнагаспадарчых планаў, і гатоўнасць абараняць сацыялістычны лад ад знешніх і ўнутраных ворагаў.



## Рабаванне пасярод сацыялізму

Аднак паступова тэмпы росту расходаў на забеспячэнне функцыяніравання камандна-бюракратычнай сістэмы кіравання і абслугоўваючых яе структур, на рэалізацыю грандыёзных, але без эканамічнай аддачы праектаў, на "падкормліванне" замежных рэжымаў, якія (нярэдка толькі на словах абвяшчалі сябе сацыялістычнымі) дасягнулі гэтакага ўзроўню, што сродкаў для павышэння дабрабыту насельніцтва краіны ўжо не хапала. Усё часцей пачало практыкавацца "выпампоўванне" з насельніцтва грошай на папаўненне дзяржаўнага бюджэту:"кааператыўнае" жыллёвае будаўніцтва, павышэнне рознічных цэн, павелічэнне прамых падаткаў і інш.

У нетрах камандна-бюракратычнай сістэмы, з-за адсутнасці дзейснага кантролю з боку працоўных мас за размеркаваннем матэрыяльных і духоўных даброт па працы, сфарміравалася праслойка, якая разбагацела на паўлегальных прывілеях, хабарах, махінацыях з дзяржаўнай маёмасцю. Яна не мела патрэбы ўжо ў захаванні гарантыі права на працу, на дзяржаўную дапамогу ў выпадку страты працаздольнасці і іншых "перажыткаў сацыялізму". Больш таго, пакуль гэтыя перажыткі захоўваліся, захоўвалася і пагроза канфіскацыі маёмасці прадстаўнікамі названай праслойкі, як нажытага непрацоўнымі спосабамі.

Пацвярджэннем гэтага з'явіліся так званае "ўзбекская" і аналагічная ёй "справы" у іншых рэгіёнах краіны. У работнікаў партыйна-дзяржаўнага апарату, якіх абвінавачвалі ў сувязях з "ценявой эканомікай", былі канфіскаваны мільённыя багацці. Нядзіўна, што менавіта пасля гэтай акцыі эканамічнае жыццё краіны папоўнілі кааператыўная і прыватна-прадпрымальніцкая дзейнасці. Такім чынам "цэнавікі" і карумпіраваныя элементы ў камандна-бюракратычнай сістэме атрымалі магчымасць "адмыць" свае капіталы і пусціць іх у абарот на законнай аснове.

Але для поўнай свабоды дзеянняў ім неабходна было, па-першае, ліквідаваць дзяржаўную манаполію на сродкі вытворчасці не толькі ў тых сферах дзейнасці, куды яны былі дапушчаны, а паўсюль; па-другое, ухіліць усе "перажыткі сацыялізму" ў заканадаўстве, што перашкаджаюць уласнаму прадпрымальніцтву; па-трэцяе, вытравіць з грамадскай свядомасці ўяўленне аб тым, што ўзбагачэнне меншасці за кошт рабавання большасці — сацыяльная несправядлівасць. Для гэтага, перш за ўсё, даказваецца, што "сацыялізм нас не пракорміць". Работа адзінага народнагаспадарчага механізма арганізавана так, што непастаўка ў тэрмін, напрыклад, гаек адным са звенняў вытворчага ланцужка пагражае зрывам плана выпуску аўтамабіляў, яго канчатковым звяном. Памяншэнне аб'ёмаў закупак айчыннага збожжа, вінаграду, чаю, тытуню і іншых сельгаспрадуктаў па розных "аб'ектыўных прычынах"; закрыццё, таксама па "аб'ектыўных прычынах", вялікай колькасці прадпрыемстваў, што выпускаюць тавары народнага спажывання пры адначасовым павелічэнні ў некалькі разоў экспарту гэтых тавараў — вось што было зроблена дзеля "доказу". На фоне штучна створанага пагаршэння становішча на ўнутрысаюзным спажывецкім рынку ўсё мацней пачалі гучаць усхваленні ўмоў жыцця пры "гасудару-імператару", пры капіталістах, суправаджаемыя рэфрэнам:"Вось якога шчасця пазбавілі нас бальшавікі".

Здавалася б,КПСС павінна выступіць у абарону свайго мінулага, даказаць, што, акрамя памылак і перагібаў, яна рабіла штосьці па задавальненню матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей насельніцтва і спрабуе рабіць зараз. Але яе "вярхі", у значнай частцы карумпіраваныя, самі былі зацікаўленыя ў дыскрэдытацыі ідэй Кастрычніка, а "нізы", выхаваныя партыйнай дысцыплінай, аказаліся няздольнымі да самастойных рашэнняў. Гэтак і атрымалася, што словы непісьменнага махноўца "...Вы рэвалюцыю прадалі..." займелі сучаснае гучанне. На гэты раз прададзенымі аказаліся інтарэсы тых, хто не мае іншых крыніц для існавання, акрамя працы па найму, ці, наогул, існуе на выдаткоўваемыя грамадствам сродкі.

## "Добрага дзядзькі" не будзе

Што ж, з'ява не новая. Хто хаця б трохі помніць курс гісторыі, напэўна, успомніць аналагічныя ўчынкі разбагацелых паплечнікаў "сялянскага цара" Івайлы ў Балгарыі, важака "худых людзей" Мікеле Ланда, які прыйшоў да ўлады пасля паўстання чомпі ў Фларэнцыі ў 1378г... Даўно прыйшоў час адмовіцца ад наіўнай веры ў "добрага цара", "добрага прэзідэнта", "добры парламент". Урокі гісторыі, у тым ліку і нашай паслякастрычніцкай, вучаць, што дабрыня ўлад праяўляецца адносна толькі тых сацыяльных слаёў, якія настолькі моцныя, што могуць дыктаваць свае патрабаванні ўладзе.

Менавіта таму сёння ў краіне ідзе інтэнсіўны працэс задавальнення жаданняў айчынных і замежных капіталаўкладальнікаў, якія "падкормліваюць" прама ці ўскосна як саюзныя, так і рэспубліканскія структуры кіравання. У іх інтарэсах фарсіруюцца мерапрыемствы па прыватызацыі, а дакладней — па продажу прыродных і створаных працай усіх народаў СССР багаццяў. Для атрымання імі максімальнага прыбытку праводзіцца "лібералізацыя", а дакладней — узніманне цэн, увядзенне платы за паслугі, якія да нядаўняга часу аказваліся бясплатна, стварэнне "рынку працоўнай сілы", калі на працу будуць прымацца толькі тыя, хто пагодзіцца з умовамі работадаўцаў...

І ўсё гэта будзе працягвацца, пакуль тыя, хто жыве на адну зарплату (стыпендыю, пенсію, дапамогу), будуць згодныя купляць тавары за назначаныя цэны, пакуль знойдуцца згодныя працаваць за зарплату, не адпаведную рыначным цэнам, пакуль на абарону звольненага не будуць падымацца ўсе члены яго працоўнага калектыву, пакуль усе тыя, на жыццёвым узроўні якіх адмоўна адбіваюцца сучасныя пераўтварэнні, не зразумеюць: пагаршэнне іх жыцця — вынік іх пасіўнага чакання. Пара ўжо запомніць, што такое "абяцанкі", і верыць не ім, а канкрэтным справам.

**Юры АФОНІН,**
**гісторык.**

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Такім чынам , сёлета 7-е лістапада як дзяржаўнае свята, як "чырвоны лісток календара" мы адзначаем у апошні раз. З наступнага года гэты дзень будзе звычайным, будзённым. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыйшоў да наступнага вынёску, зацверджанага ажно двума галасаваннямі,– 7 лістапада – не рэвалюцыйна-пераможная дата, а дзень дзяржаўнага перавароту, учыненага партыяй бальшавікоў, таму і з'яўляецца не ўсенародным святам, а святам адной, асобна ўзятай партыі – камуністычнай. Пры сённяшняй шматпартыйнасці прызначаць як дзяржаўныя, народна-святочныя чырвоныя часіны кожнай партыі – заблытаешся ў святах, вырашылі парламентарыі.

Наш даўні аўтар Юры Іванавіч Афонін – прыхільнік сацыялістычнай ідэі, чалавек, які не займеў ад служэння ёй ані пасад, ані шматквадратнаметровых кватэр, ані партыйных дачаў, ані шыкоўных машын, анічагусенькі...

Думаем, ён мае маральнае права паразважаць "з нагоды свята".

# ПЯРЭВАРАТНІ

**Карупцыя ў перакладзе з латыні азначае подкуп, прамое выкарыстанне службовымі асобамі правоў, забяспечаных пасадай, дзеля ўласнага ўзбагачэння.**

Карупцыя, «Савецкая энцыклапедыя» падкрэслівае гэта, характэрная для буржуазных дзяржавы і грамадства (подкуп чыноўнікаў, грамадска-палітычных дзеячаў, хабарніцтва). Атрымліваецца, прадажчасць службовых асоб «квітнее» недзе там, на дзікім Захадзе, і, зразумела, сацыялістычнае грамадства нат не чула пра такую з'яву. Даруем энцыклапедыі яе «савецкасць», ідэалагічную закамплексаванасць спішам на год выпуску — 1987-ы. Але карупцыя ў нас была, ёсць і, крый Божа, застанецца.

Некаторыя работнікі апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, здаецца, паверылі ў сваю беспакаранасць. Вось і трактуюць шаноўныя кіраўнікі Закон «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Рэспублікі Беларусь» як ім прыемней. Самае ж цікавае, што саноўныя парушальнікі Закона застаюцца ў цяні і не нясуць аніякай адказнасці. Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю МУС РБ з ног збіліся ў імкненні навесці прававы парадак. На мяжы рэспублікі было разгорнута 55 (!) кантрольна-прапускных пунктаў, у тым ліку 17 — на чыгунцы і ў аэрапортах: задзейнічаныя 573 (!) супрацоўнікі міліцыі. У жніўні для падтрымкі былі выдзелены дадатковыя сілы — 275 міліцыянтаў, адкрыта яшчэ 25 КПП.

За ледзь ці не год дзеяння Закона — абаронцамі спажывецкага рынку выяўлена 7037 фактаў парушэння ягоных нормаў, прадухілены 2289 незаконных вывазаў тавараў, сыравіны і прадукцыі на агульную суму — 45 мільёнаў рублёў. Адказ, атрыманы мной з МУС рэспублікі, за подпісам начальніка ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю спадара Шафарэнкі, сведчыць: многія службовыя асобы міністэрстваў і ведамстваў пад шыльдай «інтарэсы рэспублікі» хаваюць цынічнае ігнараванне закона. У Мінгандлі і Камітэце па дзяржзабеспячэнню выяўлены шматлікія факты супрацьзаконнай выдачы ліцэнзій на вываз за межы рэспублікі тавараў, якія забараняецца вывозіць пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 лістапада 1990 года за № 275. Вось далёка не поўны пералік асоб, што разбазарваюць народнае дабро.

Спадар Краўчанка, намеснік міністра гандлю. У парушэнне названай пастановы выдаў больш як 50 дазволаў на вываз з рэспублікі вострадэфіцытных тавараў. У прыватнасці 30 мая б. г. работнікі КПП аэрапорта «Мінск-2» канфіскавалі ў жыхара Арменіі Белуяна 10 тэлевізараў «Гарызонт» і 630 рулонаў шпалер. Ён набыў гэта за наяўны разлік у Баранавіцкім філіяле Брэсцкага тэхнагандлёвага цэнтра «Арбітасервіс» і ў малым прадпрыемстве «Гарант» г. Барысава ў абмен на абяцаныя аўтамашыны, ракавіны і унітазы. Дазволу на вываз гэтай прадукцыі не мелася. Толькі пасля канфіскацыі Белуян прадставіў ліцэнзію, падпісаную намеснікам міністра гандлю спадаром Краўчанкам. На аснове гэтай ліцэнзіі Смалявіцкі раённы суд вынес апраўдальнае рашэнне.

11 чэрвеня б. г. у аэрапорце «Мінск-2» супрацоўнікі міліцыі затрымалі жыхароў Арменіі Матэвасяна і Мынурыяна, якія імкнуліся вывезці 27 фотаапаратаў. Усё той жа дабрадзей Краўчанка дае зялёнае святло на вываз.

16 чэрвеня б. г. на Краўчанку супрацоўнікі УБЭЗ МУС РБ складаюць пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным арт. 11 Закона рэспублікі «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку БССР», за незаконную выдачу ліцэнзій: 13 чэрвеня — на 10 тэлевізараў і 50 швейных машын; 16 чэрвеня — на 5 халадзільнікаў; 23 чэрвеня — на 300 тэлевізараў і г. д.

І што ж? Знаходзяцца іншыя дабрадзеі. Савет Міністраў рэспублікі тэрмінова выдае пастанову № 320 ад 16 жніўня 1991 г. Гэта пастанова — лаз для асоб, што парушылі заканадаўства. За такія ж адміністрацыйныя правапарушэнні да адказнасці прыцягваецца намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню РБ спадар Цыганкоў. Адміністрацыйны пратакол у адносінах да яго быў накіраваны ў народны суд Кастрычніцкага раёна г. Мінска, аднак да адказнасці ён не прыцягнуты. З боку Пракуратуры рэспублікі па прадстаўленню МУС выносіцца пратэст на рашэнне суда першай інстанцыі. Адміністрацыйны матэрыял накіраваны 1 жніўня ў Мінскі гарадскі суд, але дагэтуль ніякага рашэння не прынята. 1 кастрычніка бягучага года прадухілены незаконны вываз за межы рэспублікі туалетнай вады імпартнай вытворчасці на суму 16 млн. 820 тыс. рублёў. Парушальнік — віцебскае малое дзяржаўнае прадпрыемства «Верас». На думку спадара Шафарэнкі, народны суд Кастрычніцкага раёна і Вярхоўны суд РБ насуперак закону спынілі адміністрацыйную справу з-за адсутнасці саставу правапарушэння. З дакладной запіскі міністра ўнутраных спраў Ягорава (іск № 1/189 ад 28.06.91) на імя Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь т. Кебіча В. Ф.: «19 ліпеня б. г. прадухілены незаконны вываз 1.379.000 кв. дм скуравіны. Скураны тавар у Арменію імкнуліся вывезці прадстаўнікі кааператыва «Сявак-3» г. Ерэвана ўзамен 2200 пар абутку. З вывозімай сыравіны можна было зрабіць 50 тысяч пар абутку.

І гэта адбываецца ў той час. калі з-за недахопу сыравіны гарбарныя заводы недадаюць абутковай прамысловасці 127 млн. кв. дм хромавых, 7 млн. кв. дм жорсткіх, не хапае юхтовых скураных тавараў. Службовыя асобы матывавалі сэнс здзелак тым, што ў Беларусь узамен скураной сыравіны паступае вялікая колькасць цэменту, аднак праверкай гэта не пацвердзілася — дастаўка цэменту не звязана з вывазам скуры. Гэты спіс можна б прадоўжыць і надалей, але, на маю думку, і зазначанага дастаткова, каб чытач зразумеў, як рулявыя гавораць адно, думаюць другое, а робяць трэцяе.

Мяркую, што абранне Генеральным пракурорам спадара Ігнатовіча з перапарадкаваным КДБ РБ дапамогуць паставіць усе кропкі над «і».

Віктар КУЧЫНСКІ,
народны дэпутат Рэспублікі Беларусь.



**Хачу прадоўжыць гутарку, якую пачаў прафесар І. І. Дуда ў артыкуле «Хто ты, доктар!» («Чырвоная змена», № 25). Цалкам згаджаюся: сучасная падрыхтоўка ўрачэбных кадраў недасканалая і не адпавядае сусветным стандартам.**

**У пацвярджэнне магу прывесці прыклад. Былы хірург 9-й клінічнай бальніцы г. Мінска, доктар медыцынскіх навук, не здолеў працаваць у ЗША па сваёй спецыяльнасці і быў вымушаны ўладкавацца працаваць шафёрам таксі. А ягоная жонка, урач, — медсястрой.**

# «ХТО ТЫ, ДОКТАР?»

Адна з прычын такога недаверу да дыпломаў савецкіх урачоў — парушэнне традыцый і разрыў пераемнасці медыцынскай адукацыі ў нашай краіне. Бо параўнальна нядаўна карціна была зусім іншай. Прапаную вашай увазе кароткі гістарычны экскурс. У мінулым стагоддзі ўрачы нашай краіны па сваёй кваліфікацыі значна перасягалі замежных калег. Ні адзін урач, які скончыў навучальную ўстанову за мяжой і нават меў там практыку і вучоную ступень, не мог уладкавацца на службу ў Расіі, калі не здаваў адпаведных экзаменаў у медыцынскай калегіі.

Высокі прафесіянальны ўзровень медыкаў забяспечваўся строгім адборам будучых студэнтаў. Гэта бачна на прыкладзе Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. Конкурс у яе перавышаў пяць чалавек на месца. Акадэмія імкнулася прыцягваць здольную моладзь з усёй краіны, таму ўступныя экзамены ў ёй прымаліся не толькі на рускай, але і на французскай, нямецкай і польскай мовах. Насуперак існуючаму меркаванню, нацыянальнай варожасці ў вышэйшых навучальных установах тады не існавала. У акадэміі навучаліся рускія, украінцы, беларусы, палякі, немцы, татары, французы, шведы, фіны, яўрэі, людзі іншых нацыянальнасцей. Разнастайным быў і сацыяльны састаў: дзеці дваран, свяшчэннікаў, сялян, мяшчан, ваеннаслужачых і разначынцаў. Тут таксама давучваліся замежныя ўрачы і нават дактары медыцыны, якія не вытрымалі экзамены ў медыцынскай калегіі.

Асноўным крытэрыем былі веды, таму высокія патрабаванні захоўваліся ўвесь перыяд навучання. Калі студэнт не здаваў адзін экзамен, то яго пакідалі на тым жа курсе для паўторнага навучання, пры нязданчы двух — выключалі з навучальнай установы (у нашыя дні практыкуецца пераздача той ці іншай навуковай дысцыпліны). Толькі трэцяя частка пераадольвала пяцігадовы акадэмічны курс і атрымлівала ўрачэбны дыплом. Нядзіўна, што са сцен навучальнай установы выходзілі высокаадукаваныя спецыялісты, якія працавалі ў розных рэгіёнах краіны, у тым ліку і на Беларусі.

У дарэвалюцыйным Мінску, як і ва ўсёй Беларусі, не было вышэйшай медыцынскай школы. Аднак у горадзе працавала нямала ўрачоў са ступенню доктара медыцыны, што сведчыла аб іх высокай кваліфікацыі. Нашых дарэвалюцыйных калег нярэдка запрашалі прыват-дацэнтамі (пазаштатныя выкладчыкі) ва універсітэцкія цэнтры і нават выбіралі прафесарамі. Так, напрыклад, А. Сініцкі быў выбраны прафесарам Варшаўскага універсітэта. Н. Цыбульскі — прафесарам Кракаўскага універсітэта. Урач Мінскай губернскай бальніцы Ф. Кодзіс да прыезду ў горад загадваў кафедрай Вашынгтонскага універсітэта ў г. Сан-Луіс у ЗША.

Мінскія ўрачы былі на грэбені сусветнай навукі. Нагадаем, што яны пачалі ўжываць настойку ёду для апрацоўкі аперацыйнага поля раней, чым гэта зрабіў італьянскі хірург Антоніо Гросіх, якога лічаць вынаходцам названага метаду. Падобных прыкладаў было нямала, таму замежныя перыядычныя медыцынскія выданні ахвотна прадастаўлялі свае старонкі беларускім урачам (С. Ліпінскаму, Ф. Кодзісу, І. Афенбергу і інш.) а працы Таварыства ўрачоў Магілёўскай губерні рэферыраваліся ў Швейцарыі.

Беларускія ўрачэбныя таварыствы былі цэнтрамі навуковай медыцынскай думкі. Яны рэгулярна выдавалі свае «Пратаколы», «Працы», а затым і часопіс «Минские врачебные известия». Вядомыя айчынныя і замежныя навукоўцы (В. Манасеін, П. Лесгафт, І. Сечанаў, І. Мечнікаў, В. Красоўскі, В. Падвысоцкі, Ян Мікуліч, Луі Пастэр і шматлікія іншыя) лічылі за гонар быць ганаровымі членамі. Аб гэтым сведчаць лісты, што захоўваюцца ў Цэнтральным Дзяржаўным гістарычным архіве БССР, а дыплом І. Сечанава аб выбранні яго членам Таварыства мінскіх урачоў і зараз упрыгожвае яго былы кабінет у 1-м Маскоўскім медыцынскім інстытуце.

Высокі прафесіяналізм беларускія медыкі спалучалі з такой жа інтэлектуальнасцю. Амаль кожны ўрач свабодна валодаў некалькімі замежнымі мовамі. Пры наведванні клінік Берліна, Будапешта, Вены, Варшавы, Парыжа, Прагі яны абыходзіліся без перакладчыкаў, а на міжнародных кангрэсах і нацыянальных з'ездах урачоў у Германіі, Францыі і Польшчы рабілі паведамленні на мове краін-арганізатараў. Не спыняючы практычнай дзейнасці, мінскі ўрач Гурвіч пераклала на рускую мову «Капітал» Карла Маркса. Пераклад яна зрабіла з нямецкага тэксту, звяраючы яго з французскім выданнем, якое выйшла пад рэдакцыяй самога аўтара. Яе пераклад быў настолькі ўдалым, што вытрымаў тры выданні (1899, 1906, 1907 гады).

У сілу сваіх магчымасцей урачы праводзілі актыўную асветніцкую работу. Яны стварылі ў Мінску 4 бібліятэкі (дзве з іх—імя А. С. Пушкіна і Л. М. Талстога —існуюць па сённяшні дзень, а медыцынская — аднавілася), адкрылі нядзельную школу для дарослых, праводзілі народныя чытанні на рускай, польскай і яўрэйскай мовах, заснавалі і ўзначалілі шэраг нацыянальна-асветніцкіх арганізацый, падрыхтавалі праект стварэння універсітэта.

Такая гісторыя. Сучаснасць, як мы ведаем, куды менш аптымістычная. Я лічу, што для «канверсавання» дыплома савецкіх медыкаў трэба перагледзець некаторыя аспекты вучэбных планаў, правесці поўную дэідэалагізацыю медыцынскай адукацыі. Урач павінен перш за ўсё лячыць, а грамадска-палітычнымі навукамі займацца ў вольны час.

Любы спецыяліст павінен добра валодаць прафесіяй. Але ўрач, які не валодае сваёй прафесіяй, — гэта грамадска небяспечная з'ява. Медык абавязаны пастаянна ўдасканальваць свае веды і павышаць кваліфікацыю. Аднак існуючая сістэма атэстацыі не садзейнічае гэтаму. Больш таго, адміністрацыя любой лячэбнай установы (бальніцы, паліклінікі, дыспансера) не зацікаўлена ў павышэнні кваліфікацыі кадраў, бо за катэгорыю трэба плаціць, а фонд зарплаты застаецца нязменным. Нярэдка атэстацыйныя камісіі выкарыстоўваюцца як органы інквізіцыі для расправы з непажаданымі людзьмі. Не заахвочваюць імкнення да ведаў і новыя ўмовы аплаты працы, якія зраўнялі вопытнага ўрача з маладым выпускніком.




Атэстоўвацца павінны ўсе ўрачы абавязкова. Згодны з аўтарам актыкула, што праводзіць атэстацыю трэба менавіта ў інстытутах удасканалення ўрачоў. Гэта дасць магчымасць пазбегнуць суб'ектывізму і павысіць цікавасць да вучобы. Крытэрыем стануць веды і навыкі, а не ўзаемаадносіны з адміністрацыяй і чыноўнікамі ўпраўлення аховы здароўя.

Узнікае пытанне — дзе знайсці сродкі? Сёння ў нашай краіне мільён трыста тысяч урачоў. Больш, чым дзесьці ў свеце. Такая колькасць нам не патрэбна. У нас шмат урачоў, якія лячэннем ніколі не займаліся і не будуць займацца: урач-статыстык, урач-метадыст, урач-адміністратар, давераны ўрач. Усе гэтыя пасады можна без шкоды для справы аховы здароўя скасаваць. Неабходна ліквідаваць ведамасную медыцыну і такія зусім не жыццёва важныя структуры, як урачэбна-фізкультурныя дыспансеры і дамы санітарнай асветы (а не змяняць назвы). Трэба было б падумаць і наконт мэтазгоднасці захавання шматлікіх і непрадукцыйных навукова-даследчых інстытутаў. І адначасова вырашыць пытанне аб скарачэнні прыёму ў медыцынскія навучальныя ўстановы.

На заканчэнне хачу спыніцца яшчэ на адным пытанні. На мой погляд, узровень прафесіянальнай падрыхтоўкі знізіцца пасля ўвядзення закона аб мове, які адмяжуе мясцовых абітурыентаў ад канкурэнцыі моладзі з іншых рэспублік. Наданне мове «карэннай» нацыі статуса дзяржаўнай не адлюстроўвае і моўную сітуацыю ў рэспубліцы. У цывілізаваных краінах са змешаным насельніцтвам робяць інакш. У Швейцарыі функцыяніруюць тры дзяржаўныя мовы: нямецкая, французская і італьянская. У развітых і працвітаючых краінах з неаднародным нацыянальным саставам узаконена па дзве афіцыяльныя мовы. Гэта ў Бельгіі, Канадзе, Фінляндыі і нават у маленькім герцагстве Люксембург, дзе насельніцтва ўсёй краіны не дасягае нават паўмільёна чалавек.

Трэба зазначыць, што беларускія медыкі заўсёды былі пазбаўлены нацыянальнай адасобленасці. Таварыствы ўрачоў Беларусі з дня свайго нараджэння (1862 г.) вызначаліся сваім шматнацыянальным саставам і адсутнасцю нацыянальнай варожасці. Ва ўмовах нацыяналізму і шавінізму, культывуемага царызмам, яны аб'ядналі рускіх, беларусаў, палякаў, яўрэяў, літоўцаў, немцаў і медыкаў іншых нацыянальнасцей і захавалі сваё адзінства. (У той час, калі некаторыя медыцынскія таварыствы імкнуліся нават у сваіх назвах падкрэсліць нацыянальны састаў. Так, у Маскве і Пецярбургу паасобку існавалі таварыствы нямецкіх і рускіх урачоў, у Рызе—таварыства нямецкіх, а затым былі створаны яшчэ тры таварыствы — рускіх, літоўскіх і яўрэйскіх урачоў. Такая ж карціна назіралася ў Каўнасе, Шаўляі, Панявежысе і іншых гарадах).

Добры закон аб мове ці дрэнны, але ён дзейнічае і яго трэба выконваць. Аднак жыццё не даруе памылак. Практыка прымянення закона прымусіць рана ці позна (лепш рана) унесці ў яго адпаведныя змены.

**А. МАЛЧАНАЎ,**
**урач Мінскага гарадскога анкалагічнага дыспансера, кандыдат медыцынскіх навук.**


МИНСКІЯ
ВРАЧЕБНЫЯ ИЗВѢСТІЯ
ЕЖЕМѢСЯЧНЫЙ НАУЧНЫЙ и БЫТОВОЙ ЖУРНАЛЪ
Общества Минскихъ Врачей.
Tuberculinum purum
ENDOTIN
БОРЖОМЪ
ПРЕДОХРАНЯЕТЪ








# Заснуць і не прачнуцца

**«Людзі — маленькія язычкі полымя, ледзь абароненыя сценамі ад буры знішчэння і вар'яцтва. Яны трапешчуць пад яе парывамі і кожную хвіліну гатовыя згаснуць назаўсёды».**

**ЭРЫХ МАРЫЯ РЭМАРК.**

«...Мне здаецца, што ўсё ў свеце і за яго межамі — гэта неба. І людзі, і кветкі, і дрэвы, і зоркі. І ўсё навокал павінна быць лёгка і свабодна — цудоўнага нябеснага колеру...»

Гэтым запісам Света пачынае свой першы дзённік. Ёй шаснаццаць. Усяго шаснаццаць.

«...Толькі што прыляцела з міністэрскай кантрольнай па фізіцы, а маці адразу раскрычалася, што я не ўсё паспела рашыць. У мяне і так гэтай фізікай быў сапсаваны настрой, а тут я наогул амаль не разраўлася. Але стрымалася. Фіг з ёй, з гэтай фізікай. Не ў фізіцы шчасце. А ў чым тады? Не ведаю. Але я шчаслівая заўсёды пасля добрага футбола, пасля добрых успамінаў і цудоўнага надвор'я. А галоўнае тады, калі пасля маіх жартаў усе смяюцца, і ва ўсіх добры настрой. Тады я разумею, што ўсё астатняе — лухта, што ніякая фізіка не вартая таго, каб з-за яе псаваўся настрой...»



Бой-дзяўчынка — такой яе запомнілі былыя аднакласнікі. Жыццярадасная, заўсёды поўная энергіі прынцыпіялка-максімалістка. Да вар'яцтва любіла футбол, магла разраўціся з-за таго, што «Дынама» (Мн.) прайграла «Спартаку»—3:0. Самыя заўзятыя двоечнікі і хуліганы паважалі і нават трохі пабойваліся яе. Гаварыла заўсёды тое, што думала. У вочы.

«...Я вельмі часта стала задаваць сабе пытанне: «Чаму іншыя жывуць ціха і спакойна, а ў мяне вечна ўсё не так, як у людзей. І дастаецца мне заўсёды больш за ўсіх. Ці гэта проста таму, што ў мяне вельмі агаленыя нервы? Я ўсё вельмі балюча ўспрымаю, хаця знешне выглядаю зусім спакойнай. І заўсёды адчуваю сябе адзінокай. Мяне яшчэ нікому не ўдалося (і ці ўдасца?) зразумець да канца. Здавалася б, столькі сяброўак, сяброў, а ты ўсё роўна адзінокая. Адна...»

Пачуццё адзіноты — гэта хвароба накшталт вар'яцтва ці хранічнага алкагалізму. І нехта схільны да яе, а нехта не. Часам думка, што няма куды і няма да каго пайсці, звярнуцца з просьбай аб спачуванні і любві настолькі авалодвае свядомасцю, што хочацца зусім адмовіцца ад жыцця... Святлана захварэла, калі ёй было 17 гадоў.

18 гадоў. «Маё існаванне стала падобнае на замкнёнае кола. Пачатковай і канчатковай кропкай з'яўляецца адзінота. Сырая, гнуткая і страшная...

Плюмбум. Ён нагадаў мне дзяцінства.

Якой я стала? Гады тры таму нават уявіць сабе не магла, што ў мяне будзе такое жыццё. Я зневажала і ненавідзела яго ТАКОЕ. А цяпер? Цяпер шэпт у спіну: «бл...» Уздрыгваю, схіляю галаву і зноў жыву. Я не бл..., але каму дакажаш? Праўда, гэтым мае разрадкі інакш за «бл......» не назавеш. Але без іх яшчэ больш нудна».

Святлана К. дзяўчына з удачнай сям'і. Студэнтка прэстыжнай ВНУ. Камсамольская актывістка.

Святлана К. Прастытутка. Наркаманка. Самагубца-няўдачніца.

«...Я не люблю спелыя парэчкі. Калі я гляджу на вялікія чорныя і вільготныя пасля дажджу ягады, мне здаецца, што гэта — вочы. Ягоныя вочы...

Я не магу спакойна глядзець на мора пшаніцы. І калі, заплюшчыўшы вочы, падаю ў яго, калі мае рукі, плечы, твар дакранаюцца да залатых жорсткіх каласоў, мне здаецца, што я дакранаюся да ягоных валасоў. Я зарываюся ў іх з галавой і плачу, сутаргава і балюча. Іх калыша паветра, і яны асцярожна кранаюць мае вільготныя шчокі сваімі вусікамі, абдымаюць, цалуючы ў вочы...

Я ніколі не вып'ю ні кроплі дажджавой вады. Таму што, калі халодныя вільготныя струмені ўпіваюцца ў мае вусны, я ўзгадваю яго пацалунак. Першы і... апошні...

Ён для мяне тады быў таксама першым і апошнім. Толькі я, дурненькая пятнаццацігадовая дзяўчынка, ніяк не магла зразумець гэтага.

— Я нічога не абяцаю, — шапталі мае сухія вусны.

— Я нічога не абяцаю, — паўтаралі мае спалоханыя вочы.

— Я нічога не абяцаю, — і ўпартыя дзіцячыя рукі імкнуліся адпіхнуць яго, ішоўшага насустрач.

— А мне нічога і не трэба. Я ведаю, ты будзеш мяне кахаць, — адказвала яго хітрая ўсмешка.

— Я ведаю, ты будзеш мяне кахаць, — паўтаралі ззяючыя, нібыта пасля дажджу, вочы-парэчкі.

— Ты будзеш мяне кахаць, таму што я кахаю цябе, — і яго моцныя загарэлыя рукі прыцягвалі мяне, і вільготны дажджавы пацалунак упіўся ў мае вусны.

— Не ведаю, ці звярнуся наогул, але да цябе вярнуся, — сказаў ён на развітанне. — Потым ты ўсё зразумееш.

І я зразумела. Усё зразумела. Але позна.

Там. Далёка-далёка. Там — у Афгане яго вясёлае, такое жывое і добрае сэрца спынілася. Перастала балець і плакаць.

Я кахаю цябе! Ці чуеш? Кахаю! І ты — мой цяпер! І ніхто ніколі не забярэ цябе ў мяне. Нават смерць. Толькі вельмі балюча і страшна, што больш не ўбачу цябе жывым. Што больш ніколі не падкінуць мяне ўверх твае загарэлыя рукі. Што больш ніколі не ўздыхне твая ўсмешка: «Эх, малышка! Калі ж ты вырасцеш?..»

І ўжо ніколі я не буду той маленькай і чыстай дзяўчынкай. Прабач...»

Калі я сустракаю такіх людзей, як Святлана, мне здаецца, што яны нарадзіліся не ў свой час. Ці не на той планеце. Непапраўныя лірыкі—так, здаецца, іх называюць. Ім больш, чым камусьці іншаму, патрэбны святло і радасць. Для жыцця. Жыцця.

«— Ха... Ты самы апошні з людзей. Ты — нават не чалавек, ты — жывёліна. Бруд! Нікчэмнасць! Такіх не трэба выцягваць са дна. Такіх трэба таптаць! Душыць! Адстрэльваць!

— Божа! Дык задушыце мяне! Забіце. Толькі не мучце больш. Сама я не магу з сабой пакончыць. Я занадта яшчэ на нешта надзеюся...»

19 гадоў. «...— Я павінна забіць жывое жыццё. Божа! Я не хачу! А што рабіць? Так будзе прасцей. Табе — дзевятнаццаць усяго.

— Але гэта жорстка. Ён жа ні ў чым не вінаваты!..

— А дзіця без бацькі — гэта не жорстка?! А твая маці, якая проста не перажыве, — гэта не жорстка?! А сястрычка, для якой ты — ідэал. Яна ж зломіцца, перастане верыць у людзей...

— Так. Але так прыйдзецца ўсіх усё жыццё ашукваць. А я не магу, не магу плаціць за сябе чужым жыццём. Гэта ж подласць! Кляймо!

— Ды паглядзі на сябе. Ты ж даўно ўжо ўся заклеймаваная. Ты ў іх, нібы ў струпах. Пракажоная!..»

Чытаючы гэтыя радкі ў дзённіку Святланы, прыгадваю словы Андрэя Платонава: «...размаўляць самому з сабой — гэта мастацтва...» Але што гэта? Самакатаванне ці... сумленне?

«...— Цябе нешта мучыць?

— Канешне, у мяне ж не было «правільнага» жыцця. Не тое што ў некаторых. «Маральны кодэкс...» і я — зусім несумяшчальныя рэчы. Але такія, як я, — патрэбны. Трэба ж на кагосьці звальваць свае грахі. Трэба ж з кагосьці здзекавацца, кагосьці абліваць брудам. Свая скура выглядае святлейшай на брудным фоне...

...Не ўяўляю, што б рабіла грамадства без прастытутак. Нуда. А так — заўсёды ёсць магчымасць пазабаўляцца...

...Ненавіджу! Ненавіджу ўсіх чыстых, таму што за сваёй чысцінёй яны хаваюць брудную душонку, натуру жывёлін. Яны распушчаныя горш за любую кончаную бл... Паўсюль — фальш, паўсюль — маскі. Як жа тут верыць людзям? Ды і ці жывуць яны яшчэ на Зямлі? Ау-у! Бачыш: цішыня. І я таксама не чалавек. Цацка, скура, жывёліна...

Але ж я не хачу гэтага...»

20 гадоў. «Сёння тры гады, як ён загінуў. А я «жыву». Хочацца плакаць. Але галава цяжкая, а слёз няма. І сумлення няма. І жыцця няма. Нічога. Толькі тлеючая цыгарэта, дрыжачая рука і шпрыц.

Праз гадзіну засну. І лепш бы не прачынацца зусім. А чаму б і не. Гэтыя тры гады — нібыта трыццаць. 17 плюс 30 = 47. Самы час паміраць, каб не нарабіць яшчэ больш глупстваў. Каб не пакутаваць самой і не мучыць іншых. І Яго. Хаця ён ужо мёртвы. Ён — дух. Ён — ікона. Але, Божа мой, як мала я на яе малілася.

Я сёння памру. Засну і не прачнуся. Проста шмат усяго. Няма сіл і нікога няма...»

Апошні запіс быў зроблены ў той дзень, калі Святлану знайшлі напаўмёртвую ў ваннай, дзе вада была бурага ад крыві колеру.

«Мне здаецца, — пісала яна калісьці, — што ўсё ў свеце і за яго межамі — гэта неба. І людзі, і кветкі, і дрэвы, і зоркі. І ўсё навокал павінна быць лёгка і свабодна — цудоўнага нябеснага колеру...»

**А. КРАЎЧАНКА,**
**студэнт журфака БДУ імя У. І. Леніна.**



# Вечаровыя песні

## Нататкі публіцыста

Адчуваю, што час настаў... І калі не цяпер, дык пасля ўжо не напішу. Буду надта ж блізка. Вельмі скароціцца адлегласць паміж мною і тымі, пра каго збіраюся гаварыць.

А гаварыць я збіраюся аб старых людзях...

Разумею, наколькі няпэўнае гэта пачуццё. Калі ў маленстве глядзіш знізу ўверх на чалавечую піраміду, то не асабліва адрозніваеш, каму шэсцьдзесят гадоў, а каму восемдзесят. Усё аднолькава далёка і сумна. Няўжо, думалася тады, ім таксама цікава жыць?

Ім, старым людзям...

Што ж, юнацтва і маладосць, падобныя да бесклапотнага жаўранка, маюць свае ранішнія песні. А ў старасці свае песні — вечаровыя.

Дык так яно і ёсць: кожны чалавек усё жыццё вядзе сваю непаўторную мелодыю: спачатку яна гучыць наіўназдзіўлена, потым, у сталасці, больш упэўнена і гучней і, нарэшце, з узростам песенныя гукі душы замаруджваюцца, цішэюць. Яны быццам лішні раз баяцца напомніць аб сабе, каб не адцягваць увагу моладзі ад яе вялікіх і важных спраў.

Прыглядзьцеся, як малое дзіця зачаравана шкадуе птушаня, якое выпала з гнязда, як слёзна ўмольвае яно бацькоў узяць бяздомнага шчанюка... Але мне чамусьці цяжка прыпомніць, каб маленькі чалавек глядзеў на старога са спагадай і спачуваннем. У лепшым выпадку — з цікаўнасцю ў вачах. Быццам нейкая сцяна паміж імі. Між тымі, хто толькі што прыйшоў у свет і хто рыхтуецца яго пакінуць. Сталеючы, мы апасліва-насцярожанымі крокамі ўсё бліжэй падыходзім да гэтай крохкай, празрыстай сцяны. І вось ужо наблізіліся да яе ўпрытык. Расплюшчылі свой нос аб шкло, пільна ўглядаемся... Чымсьці знаёмыя, зачароўваюць нас гэтыя старыя аблічча, іх твары. Чымсьці смутна хвалююць. З трывогай адчуваем, што ёсць у іх нейкая тайна, і тайна гэта тычыцца нас таксама.

Аднойчы ў краме я стаяў у чарзе за бабуляй. Як жа паспешліва-мітуслівымі былі яе рухі, калі яна складвала пакункі ў сумку, брала рэшту. А некалькі дзён назад позірк выхапіў з ранішняй таўкатні метро постаць дзядка — ён, штохвілінна аглядваючыся, саступаў усім дарогу, прыхінаючыся да мармуровай сцяны. Мімволі падумалася: гэтыя людзі быццам бы хочуць быць больш непрыкметнымі, каб толькі не замінаць нам, поўным сілы, жаданняў, імпэту. А мы, бывае, бурчым: і чаго ім не рымсціцца, чаму не сядзіцца?.. Нам і ў галаў не прыйдзе, што гэты дзед, магчыма, едзе суцешыць свайго сябра ваенных гадоў, апошняга з жывых аднапалчан. А бабуля гэтак даўно хацела паласаваць гасцінцамі ўнукаў, а мо і праўнукаў, якія жывуць у іншым горадзе...

І мы, нярэдка здараецца, імчымся далей, нават не глянуўшы ў іхні бок, і нашы ранішнія і паўдзённыя песні звіняць, лёгка заглушаючы іх, вечаровыя...

Хто ж такія яны, нашы адзінокія сувайчыннікі — дзядулі і бабулі, нашы аднавяскоўцы, аднавякоўцы. Яшчэ нядаўна яны будавалі, вучылі, варылі сталь, шылі... Надышла старасць, нямоглэсць. Аслабелі рукі і ногі. Але памыляецца той, хто лічыць, што чалавек немалады, дык і жыццё ў яго нішчымнае, нібыта і няма таго жыцця, а так — адно існаванне. Аб гэтым разважаеш як у горадзе, так і ў вёсцы, дзе праблема адзінокай старасці сёння стаіць таксама надзвычай востра, надзённа.

Не адзін раз мне даводзілася бываць у невялікай вёсцы Гулічы, што на Брэстчыне,— гэта вёска ўваходзіць у заможны калгас «Беларусь». І раней шы старшыня Аляксандр Іосіфавіч Бокач і яго паслядоўнік Віталь Іванавіч Бусько праяўлялі заўсёдны клопат аб пенсіянерах, ветэранах працы, вайны.

Вось і на гэты раз у кабінет да старшыні зайшла М. Я. Кунцэвіч, пажылая жанчына.

— Іванавіч, надумала я прадаць карову. Хоць і цяжка без малака, але што рабіць...

— Чаму гэта?

— Сам разумееш, не тыя ўжо сілы.

Старшыня схамянуўся:

— Калі справа толькі ў кармах, карову не прадавай. Сена табе прывязём, абяцаю. Чуў, што некаторыя жанчыны таксама настроіліся расстацца з рагулямі. Зайдзі да іх і запэўні, што сена ўсім выдзелім. Няхай не хвалююцца.

І той візіт, і размова ў старшынёвым кабінеце не былі выпадковымі. Справа ў тым, што неафіцыйна клопат аб ветэранах у гаспадарцы ляжыць на старшыні. А адносіцца Бусько да гэтай місіі вельмі сур'ёзна. Добра помніць вядомую ісціну: сутнасць чалавека, асабліва кіраўніка, праяўляецца ў яго адносінах да старых і малых. Менш за ўсё Бусько заняты дабрачыннасцю і апякунствам. Тут практычнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва двух бакоў. Для старшыні калгасныя ветэраны—крыніца гаспадарчай мудрасці і вопыту, гвардыя, на якую ён абапіраецца; гэта гвардыя ставрае на вёсцы грамадскую думку, тую атмасферу, без якой немагчыма вырашаць важныя гаспадарчыя справы.

Але каб гэтак было ўсюды! Калгас «Беларусь» не правіла, а, бадай,— выключэнне... Дзесяткі забытых, неперспектыўных вёсак, асабліва на Магілёўшчыне. У іх жывуць людзі, якія вынеслі на сваіх плячах усе цяжкасці вайны і пасляваеннай разрухі, тое пакаленне, на чыю долю выпалі неймаверныя выпрабаванні. Вядома ж, не пакінуты яны на волю лёсу, не забылі пра іх родзічы і дзяржава. Многія маюць магчымасць перабрацца ў горад, на цэнтральныя сядзібы гаспадарак. І ў жыллі ім не адмовяць. Але ж самі яны часцяком не хочуць адрывацца ад родных сцен і магілаў продкаў. І цяжкасці іх спрадвечныя, непазбежныя: гарод, карова, дровы — трэба абрабіць, накарміць, запасціся... Дзе знайсці сілы? У многіх напаўзабытых вёсках няма магазінаў, хлеб прывозяць раз-два разы ў тыдзень...

Некалькі дзён я быў сведкам няспынных клопатаў двух старых — дзеда Сцяпана Андрэевіча і яго жонкі з палескай вёскі Заверша. І цяпер, прыгадваючы старога салдата, удзельніка Сталінградскай бітвы, перажываю пачуццё болю і віны. Іх дачка вывучылася, жыве сваёй сям'ёй у горадзе, наязджае толькі ўвосень — выбраць бульбу.

Аднаго разу зімой я ўбачыў, як дзед Сцяпан цягнуў санкі, нагружаныя альховымі чурбанамі. Дапамог яму давезці, ушчуваючы: чаму не звярнуўся да старшыні па дапамогу?..

— Пачакай,— запярэчыў мне дзед.— Ну, дасць ён мне машыну ці трактар. Толькі ж хто напіліць, пагрузіць? Кругом адны старыя. А калі і знайду якіх забулдыг, колькі пляшак ім трэба паставіць... А дзе тыя пляшкі? Не, лепш я ўжо сам прывязу!..

За лета дзед накастрыў два агромністыя клады альховых дроў. Трымалі яны з жонкай агарод, пару парасят, курэй. Ад відна да відна ў старых былі клопаты. І ніколі дзед Сцяпан не скардзіўся на жыццё. І памёр на хаду, ледзь толькі адзначыў свой апошні Дзень Перамогі. Адмовіла сэрца...

Дык хіба не абавязаны былі мы аблегчыць апошнія дні і гады жыцця былога франтавіка? Ці такая ўжо празмерная справа — выдзеліць у кожным сельскім раёне аўтакраму, якая б раз у тыдзень наведвала ветэранаў, інвалідаў вайны, падвозіла ім неабходныя прадукты і тавары? Ці аказаць дапамогу ў нарыхтоўцы дроў, сена?

І зноў я думкамі пераношуся ў горад. Вось сядзяць яны, старыя людзі, на бульварах і ў скверах, а навокал звініць, захлынаецца свістам малады, непаседлівы дзень. Я ўглядаюся ў іхнія твары і сэрца апаноўвае сум-напамінак: так, гэты сонечны дзень узышоў і акрэп у іх моцных калісьці руках. Хіба маем мы права забываць пра гэта хоць на міг, на хвіліну, нават калі няўдачы аднімаюць у нас сілы, а нашы старыя гэткія бездапаможна-марудлівыя і някемныя. Не, не маем такога права!

**І зноўку думаю пра старых адзінокіх людзей, аб іх парой драматычным лёсе. І хочацца, каб блізкія людзі, якія маюць намер аддаць састарэлага родзіча ў інтэрнат, бачылі, як такі ўчынак выглядае збоку. Бо ад хваробы і тым болей ад старасці ніхто з нас не застрахаваны. Чаму ж многія паводзяць сябе так, быццам, пасеяўшы зло, самі сажнуць толькі дабро? Марныя надзеі. Створанае сёння зло набярэ разбуральную сілу і назаўтра павернецца для самога такога сейбіта невымернай бядой...**

**Дзеля шчырасці варта зазначыць, што людзі сардэчныя, неканфліктныя значна радзей аказваюцца адзінокімі. Ведаю нямала выпадкаў, калі старая жанчына пускае на кватэру студэнтку або студэнта, каб хоць трохі дапамаглі ёй, ды так прывыкне да кватаранта ці кватаранткі, што яны адзін аднаму становяцца роднымі. Неўзабаве студэнтка замуж выходзіць, кватэру атрымлівае, а бабулю не забывае. Ведаю выпадак, калі ў належную ёй кватэру маладыя забралі былую гаспадыню, іх двухгадовы малыш называе яе бабуляй і не хоча класціся спаць без яе казак.**

**Праўда, ведаю я і бацьку, які выракся ўласнага сына толькі таму, што той ажаніўся супраць ягонай волі, і, хоць шлюб аказаўся ўдалым і ўнукі падрастаюць, дзядуля не пускае іх на парог. Ведаю маці, якая на працягу сямі гадоў катэгарычна пярэчыла супраць замуства дачкі — не падабаўся ёй выбраннік, да таго ж яе не задавальняла яго нацыянальнасць. Застаецца толькі здзіўляцца, што за такі час пачуцці маладых людзей не змяніліся і яны ўсё ж пажаніліся. Дачка пераехала да мужа ў іншы горад. Маці быць з імі прынцыпова адмовілася. Яна пачала пісаць пісьмы ва ўсе інстанцыі, заклікаючы грамадскасць асудзіць няўдзячную дачку, якая кінула на волю лёсу цяжка хворую састарэлую маці. Потым стала «бамбіць» дачку тэлеграмамі: «Цяжка хворая. Тэрмінова вылятай», «Кладуся на аперацыю, чакаю» і нават «Мае дні злічаны, прыязджай развітацца»... Дачка спяшалася да маці і даведвалася, што ўсё абышлося, што той ужо лепш. Нарэшце дачка звольнілася з працы і амаль год пражыла побач з маці. Але не развялася, як тая разлічвала. Праз год, сама хворая і змучаная бясконцымі папрокамі, вярнулася да мужа. Час і перажыванні зрабілі сваё — у мужа і жонкі няма і ўжо не можа быць дзяцей. А маці... выйшла замуж за ўдаўца з трыма дзецьмі. І па-ранейшаму кляймуе ў сваёй новай сям'і і перад усімі знаёмымі і родзічамі дачку, не разумеючы сваёй страшнай перад ёй віны.**

Вядома ж, усё гэта крайнасці, у большасці выпадкаў людзі адзінокія не па ўласнай віне — у іх няма дзяцей, вельмі часта няма нават блізкіх і родных. Але, як гаворыцца, з песні слова не выкінеш...

Мы справядліва лічым: старыя людзі — гэта вопыт пакаленняў, мудрасць у яе канчатковым выніку. Наша маральная апора. Усё гэтак, але хвалюемся і дрыжым мы за іх, і пакутуем ад немагчымасці дапамагчы ім не з-за іх вопыту і мудрасці (у нас і ў саміх, мы мяркуем, хапае гэтага дабра), а проста таму, што па-сапраўднаму любім іх. Нічога, па шчырасці, нам не трэба — толькі б жылі памаленьку. А ўжо мы і дапаможам ім, і абаронім у крайнім выпадку. Не гавару аб нейкай паталогіі, я гавару аб норме. Нам спакайней, пакуль яны ёсць на зямлі. У бяспецы сябе адчуваем — так, у бяспецы! За іх спінай гуляем, як тыя ўнукі, яны ж каля самага краю стаяць. Не мы абараняем іх, яны нас. Сваім лядашчым, нямоглым целам. Сілы няма, каб за рукі ўзяцца, ды і адлегласць вялікая, бо колькі іх равеснікаў ужо там, унізе. Зніклі, нават не войкнуўшы,— баяліся, напэўна, нас напалохаць. Так і стаяць паасобку з журботнымі вачамі, а вецер рве і матляе іх сівыя валасы.

А мы лічым, што яны адпачываюць. Але ж, так, адпачываюць, вядома, ад сваіх ранейшых спраў, але ж старасць гэта таксама праца, пажыццёвая праца і подзвіг, і як бы ні было табе кепска, а несці гэту ношу патрэбна. На іншых не перакладзеш. Ды і на каго? Моладзь не падмога, у яе свае клопаты, яна і не гатова. Старасці ж трэба вучыцца. Доўга і цярпліва, бо паскораных курсаў, дзякуй богу, няма...

А як жа тайна? Тая самая вусцішна-страшнаватая тайна, у якую кожны з нас у свой час гэтак пільна ўзіраўся, расплюшчваючы аб шкло свой кірпаты нос?

**А няма ніякай тайны. Няма... Я зразумеў гэта ў той дзень, калі не стала на свеце маёй адзінокай цёткі Тэклі. Калі здранцвелымі нагамі пераступіў парог дома, дзе стольки год пражыла яна і дзе я вымушана гаспадарыў апошнія два тыдні.**



**Гаспадарыў! Гэта толькі гаворыцца так, на самай жа справе ніякім гаспадаром я тут не быў. Рэчы ігнаравалі мяне. Хаваліся, перасхоквалі з месца на месца, і без цётухны, якая кіравала з бальнічнага ложка маімі дзеяннямі, я ніяк не справіўся б. А вось яе яны слухаліся, нават на адлегласці. Яна інструктавала: у шафе, злева, унізе — і ўсё пакорліва мне давалася ў рукі. Але толькі ў тым выпадку, калі я дакладна выконваў яе ўказанні. Варта было памыліцца, як у вочы лезлі нейкія загадкавыя скруткі і бляшанкі, прадметы невядомага прызначэння, вырваныя са школьнага сшытка лісткі з незразумелымі мне запісамі... Нібы ў дрымотным лесе знаходзіўся я. Не вясновым і нават не летнім — восеньскім, калі ўсё пажаўцела ўжо, але кроны ў дрэў яшчэ густыя.**

І раптам лісце апала. Адразу, у адзін міг — той самы, калі здарылася гэта. Пустой і голай сустрэла мяне кватэра пасля майго вяртання з бальніцы. І шафа стаяла на тым жа месцы, і стол, і ложак, вісеў яе пабляклы халацік, з пабялёнай сцяны ўсё гэтак жа глядзела «Невядомая» Крамскога, ляжаў на падаконніку дыванок, які яна не паспела давязаць, усё было мёртва, усё абыякава і бессаромна неяк агалілася. Ніякіх запаведных куткоў, аніякай тайны! Проста жыла тут старая жанчына — вось акуляры яе, каляндар, з якога яна зрывала кожны вечар лісток і чытала ўголас — на колькі большаў ці меншаў дзень, — а цяпер яе няма. Дзе яна, дзе? Вечнае пытанне, я столькі разоў чуў яго з чужых горкіх вуснаў, а цяпер сам задаваў, але адказу, зразумела, не было. Тайна жыцця пераўтварылася ў тайну смерці.

Ды я і не спрабаваў нават разгадваць яе. Навошта? Усяму свой час, і гэты час настане таксама. Не трэба спяшацца...

Не было сілы заставацца аднаму, я выйшаў на двор і доўга хадзіў па добра знаёмым і ў той жа час нейкім новым завулку. Запаліліся ліхтары. Два хлопчыкі спынілі мяне, запыталіся гучна, якая гадзіна. Спыталі моцна... Цяпер іх чарга глядзець з расплюшчанымі насамі праз шкло. Тоўстым і цвёрдым здаецца яно ім, непранікальна-глухім, а я прайшоў праз яго і нават не адчуў..

На вялікі жаль, нашым старым даволі часта прыходзіцца скардзіцца на сучасную моладзь. Думаецца, каб маладыя людзі часцей сустракаліся з тымі, для каго любая дапамога, нават самая малая,— вялікая справа, а парой і само жыццё, прыйшлі б да іх міласэрнасць і дабрыня. Да таго ж сярод старых так многа цікавых, глыбокіх і мудрых людзей, што ўжо сама сувязь з імі зрабіла б моладзь больш цярплівай і добрай. І не розумам, а сэрцам прынялі б яны простую, але такую важную ісціну: ніхто не застрахаваны ад хваробы і старасці, ад адзіноты. І калі гэта здарыцца, як важна, каб пра цябе не забыліся, паклапаціліся, каб нехта стаў тваімі рукамі, нагамі, прыйшоў да цябе з добрым словам. Маладосць і старасць не павінны аддаляцца, яны — звенні аднаго ланцуга, які называецца Жыццём.

Адыходзяць нашы дзяды і бабулі. Пакідаюць нас ціха, непрыметна. А нам іх так не хапае, і, дзіўная справа, з гадамі не хапае ўсё больш. Іх мудрасці, вопыту, даравання, ласкавага слова. Але сёння яны яшчэ з намі! І давайце зробім усё, каб іх вечаровыя песні як мага даўжэй гучалі на свеце. Нашаму неспакойнаму і складанаму свету гэтыя песні вельмі патрэбны.

Мікола **ФЕДЗЮКОВІЧ**,
пісьменнік.

НОТНЫ АРКУШ

№ 17 (188)

Музычны выпуск «Нотны аркуш» вядзе журналіст Вітаўт Мартыненка.
Тэл. 32-11-43.

*Падзея*

# На месцы Аршанскае бітвы ралля...

НАТАТКІ З ФЕСТЫВАЛЮ БАРДАЎСКАЙ ПЕСНІ «БІТВА ПАД ВОРШАЙ».

Ідэя гэтага фестывалю поўнасцю належыць нашаму «класіку беларускай аўтарскай песні» (як ён сціпла сябе азначае) Андрэю Мельнікаву: гэта ён задумаў, арганізаваў і спланаваў гэты фэст. Хаця ідэя гэтая ўжо лунала ў паветры — летась упершыню арганізавана была адзначана 476-я гадавіна Аршанскае бітвы, і на беразе Крапівенкі ў адзнаку славутай перамогі быў пастаўлены васьміканцовы крыж.

Сапраўды, мала знойдзецца месцаў, якія былі б роўныя па значнасці і славе для беларусаў, як гэта крапівенскае поле. Упоравень з ім можна паставіць хіба што поле ля Сіняй Вады, Кулікоўскае поле, дзе таксама лягло нямала нашых продкаў (аб чым дагэтуль не надта любілі згадваць), ды поле пад Грунвальдам. Але ўсё гэта за абсягамі Беларусі, а тут у нас побач, і грэх, калі гэтая дата, калі 8 верасня 1514 года 35-тысячнае войска гетмана Канстанціна Іванавіча Астрожскага ўшчэнт разграміла больш чым удвая перавышаючую армію Вялікага княства Маскоўскага, дзе нашыя продкі-ліцьвіны абаранілі свабоду і незалежнасць нашае зямлі — грэх, калі гэтая падзея не будзе адзначана хаця б бардаўскім фестывалем.

Фестываль гэты чысты «самапал», і хаця яго арганізатары канешне ж, не пазбеглі хібаў пры яго падрыхтоўцы, аднак гэта быў сапраўдны фестываль беларускай бардаўскай песні, і прайшоў ён, як потым высветлілася, на добрым узроўні. У групу арганізатараў, якая гучна найменавалася аргкамітэтам, апрача самога Мельнікава, увайшло яшчэ некалькі чалавек, у тым ліку і ваш пакорны слуга—аўтар гэтых радкоў. Спачатку ўзяўся дапамагчы ў правядзенні фэсту гарадскі камітэт камсамола, але тут накаціў гэты самы ГКЧП... І наш фундатар апынуўся павязаны па руках і нагах, а сам фестываль пад вялікім пытаннем. Што рабіць? Інфармацыя праз рэспубліканскую прэсу ўжо пайшла.

І вось тут па-сапраўднаму дапамаглі аддзел культуры гарвыканкома і прафсаюзны камітэт інструментальнага завода, забяспечыўшы фэст транспартам і апаратураю. Дзякуй ім.

Увогуле, тут усё неяк сабралася ў груд: і пераварот, і першае верасня, і свята Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне. Позна спахапіліся і з рэкламаю: як нехта небеспадстаўна пажартаваў —на кожнага выступаючага ёсць свой персанальны слухач; агульная колькасць удзельнікаў не перасягала васьмі дзесяткаў, і усё ж фестываль адбыўся. І атрымаўся.

У апошні вечар лета а дзевятай гадзіне фэст пачаўся. Да гэтага часу на невялікім поплаве вусця Крапівенкі ўжо стаяла маленькая паходная сцэна і лагер з дзесятка намётаў. Як і належыць гаспадару, фестываль распачаў Андрэй Мельнікаў. Разам з імклівымі яскамі пачаўшага набіраць сілу вогнішча ў начное неба паляцела першая песня, электронныя грудзі дынамікаў разнеслі яе над прыціхлай далінай Дняпра, над «полем Аршанскім», дзе некалі гудзела бітва, над ціхаю рэчкай Крапівенкай:

**Войска літоўскае рушыла ў паход,**
**Пешыя і конныя шляхам на ўсход,**
**Даць адпор суседскаму ка́ту-лютару,**
**Грознаму драпежніку — маскоўскаму звяру.**
**Віленцы, гародзенцы, нясвіжцы, пінчукі,**
**Трокскія коннікі, львоўскія стралкі,**
**З Менска і з Кіева, з Воршы над Дняпром,**
**З шаблямі, з дзідамі, з чырвоным шандаром.**

Жорсткая, проста-такі нейкая астынантная манера выканання Андрэя яшчэ больш падкрэслівае такое ж цвёрдае, а часам з'едліва-вострае яго паэтычнае слова. І нават калі Мельнікаў бярэ чужыя вершы, то, як правіла, гэта аўтары блізкія яму як па духу, гэтак і па форме вершавання (Алесь Змагар, Анатоль Сыс). І нават яго лірыка насычана той жа самай энергіяй і навальнічным цяжарам:

**Над нашаю краінай хмары, хмары,**
**Нашыя надзеі замятае завіруха...**

Андрэй — уладар сацыяльна-палітычнае музы. Яго песні часам нагадваюць перадавіцы адраджэнскае прэсы:

**Кожнаму — праўда, кожнаму — воля,**
**Досыць трымацца за рабскі хаўрус!**
**У кожным сэрцы хай успыхне полымя,**
**У кожнай душы хай жыве Беларусь!**

Аднак часам гэты публіцыстычны напал на мяжы юнацкага максімалізму ператвараецца ў ледзь прыкметную, але позу, якая ў сваю чаргу пагражае ператварыцца ў самапародыю. Але разам з тым Андрэй як ніхто іншы валодае пачуццём часу і вобраза; яго экскурсы ў беларускае сярэднявечча ўражваюць сваёю трапнасцю формы і слоў, закранаючы самыя чулыя струны ў душах слухачоў, а мелодыка ўсё роўна як выхаплена з вечарыны ў магнацкім замку XVI стагоддзя.

Блізкая Мельнікаву па духу творчасць барда з-пад Менска Кастуся Герашчанкі: такая ж значная доля песень сацыяльна-палітычнае накіраванасці, такая ж упэўненая і жорсткая падача матэрыялу, вострыя тэксты:

**...Як вам спіцца, таварыш Слюнькоў,**
**На крамлёўскіх харчах?**

Кастусь смела кідае пальцы на струны, умела расстаўляе акцэнты, а глядзіцца ў святле каляровых ліхтароў на фоне бел-чырвона-белага задніка сцэны і наогул выдатна. Чарнобыль у выступленнях амаль усіх займаў значнае месца, але ў Кастуся гэтая тэма гучыць асабліва ёміста і ўзвышана:

**...Толькі будзе да скону мне Чарнобыль балець.**

Асабліва мне спадабалася яго песня «На Грунвальд», сваім узнёслым пафасам яна цудоўна перагукваецца са «Шляхецкай» Мельнікава:

**І з-пад Воршы і Смаленска,**
**І з-пад Віцебска і Менска,**
**І з-пад Вільні і Мсціслава,**
**Магілёва, Ізяслава —**
**На Грунвальд з намі,**
**На Грунвальд з намі!**

Пасля я са здзіўленнем даведаўся, што аўтар гэтага верша—Зянон Пазьняк. Вось табе і празаічны змагар-парламентарый з няўсмешлівым тварам!

У Зміцера Сідаровіча куды больш мяккі стыль, які добра спалучаецца з яго някідкім голасам. Валоданне інструментам здавальняючае, але яшчэ далёкае да дасканаласці, што, дарэчы, было найбольш характэрнаю рысай усіх выступаючых. Найбольш удалымі ў гэтага хлопца мне падаліся песні, звязаныя з гістарычнай тэматыкай — тут ён знаходзіць дакладныя фарбы і вобразы. Але спектр яго тэм досыць шырокі, і не апошняе месца ў ім займаюць дасціпныя замалёўкі, так бы мовіць гарадскі фальклор. Наогул творчасць Сідаровіча неяк не ўкладваецца ў звыклы для беларускай аўтарскай песні трохкутнік: жыве Беларусь!— Чарнобыль — лірыка.

Вольга Акуліч — яскрава выражаны лірык. Аб'ект яе доследаў — унутраны свет чалавека. Палітра яе фарбаў вытрымана ў мінорных танах. І, трэба заўважыць, валодае гэтай палітраю яна выдатна. Яе даверальная, «адкрытая» манера выканання, сціплы, але выразны й цікавы голас амаль адразу знаходзяць дарогу да слухача і выклікаюць момант суперажывання:

**У восеньскі дзень, у апошні**
**Гляджуся я ў ваду...**
**Размову, відаць, завяла я пустую,**
**Але не шкадую,**
**Але не шкадую...**

За кола гэтых настрояў Вольга амаль ніколі не выходзіць. Добра гэта ці дрэнна? Як сказаць...

Таксама яскрава выражаны лірык малады аршанскі аўтар Зміцер Дзядзенка, але тэматыка яго песень куды шырэйшая. Уражанне ад яго ўвогуле неблагіх песень трохі змазвала невысокая якасць валодання гітарай і нейкая няўпэўненасць. Але яго паэтычнае слова мае свой твар і свае адметнасці. Думаецца, што лепшыя песні ў Зміцера яшчэ наперадзе.

А вось вядомую ў рэспубліцы Леру Сом мне давялося пачуць упершыню. Калі паспрабаваць выказаць уражанні адным-двума словамі — нейкая пяшчотная і адначасова драпежная, неўтаймаваная сіла, якую гэтак жа цяжка зразумець, як і не паддацца яе магічнаму ўздзеянню. Яе голас нібыта ветрык, які то ледзь кранае рамантычна-зялёнае лісце, то раптам набірае сілу ўрагана, які бязлітасна зрывае яго і нясе прэч, агольваючы заскарузлае суччa жыццёвае прозы. Адзін раз пачуўшы яе спеў, ты наўрад ці зблытаеш яе з некім потым. У яе адсутнічае яшчэ адна характэрная рыса нашых бардаў — акадэмізм. Але ёсць у Леры і сур'ёзны хіб: яна амаль не сочыць за ўласнай артыкуляцыяй, таму словы часам «грузнуць», чапляюцца адно за другое, што значна ўскладняе ўспрыманне песні.

Прыемным адкрыццём фестывалю стала выступленне дуэта братоў Дзямідчыкаў, якія паказалі ўсім, як трэба правільна спяваць на два галасы, цудоўна выканаўшы дзве песні на рэлігійныя тэксты.

Выступалі па каруселі, г. зн. пасля кожнае песні выступаючы змяняўся. Гэта было зручна й цікава як для слухачоў, гэтак і для спевакоў. Песні адна за адной узляталі ў зорнае неба і знікалі там. Здавалася, сама ноч прысела ля вогнішча і заслухалася.

Але вось недзе наперадзе пачулася брыдкаслоўе і гучны рогат — ага, гэта мясцовая моладзь абвясціла аб сваім з'яўленні. Лера зараз жа адрэагавала са сцэны вострай і здзеклівай сатырай, і жартаўнікі прыкусілі язык. А наогул усё было добра — фэст скончыўся недзе а палове трэцяй гадзіны. Хаця і засталося нейкае адчуванне не тое каб незадаволенасці ці засмучэння, але, але...

**На месцы Аршанскае бітвы — ралля...**
**Забруджана рэчка Крапівенка, дзе вораг тануў.**
**Па беразе рэчкі — дачы мясцовых зямлян,**
**Ад бойні тае з іх ніхто і ніколі ня чуў...**
**(А. Мельнікаў).**

Ю. КОПЦІК.
Фота У. ПАНАДЫ.



# Бардаўская «Бітва ц Вс



# а па Воршай»



Пасля фестывалю беларускай бардаўскай песні, які адбыўся ўвесну мінулага года ў Гомелі, аршанскі фэст «Бітва пад Воршай» стаў другой значнай вяхой у развіцці гэтага жанру папулярнай маладзёжнай песні ў нашай рэспубліцы.

Мы папярэджвалі нашых чытачоў аб ягоным пачатку 1 верасня г. г. у «Чырвонай змене» № 35 за 31 жніўня (нататка «Усе барды — у госці да нас»). Сёння на звароце гэтага постара змяшчаем роспавед непасрэднага ўдзельніка падзей Ю. КОПЦІКА.

Фота У. ПАНАДЫ.

## Аршанская бітва

**Музыка і словы Андруся МЕЛЬНІКАВА**

На месцы Аршанскае бітвы — ралля,
Забруджана рэчка Крапіўна, дзе вораг
тануў,
Па беразе рэчкі — дачы мясцовых
зямлян;
Аб бойні тае з іх ніхто і ніколі не чуў.
Забытыя рыцары тыя, што перамаглі,
Краіна зняверыла ў годнасць, магутнасць
сваю,
Адзіныя чорныя птушкі на гэтай зямлі
Адзіныя песні аб вечным адзінстве пяюць.
**РЭФРЭН:** Колькі год марылі,
Каб прыйшлі маскалі
З верай, мовай сваёй і ўрадам.
Толькі тым і жылі,
У рэшце рэшт даждалі
Дзякуй вам, дарагія браткі.
Аб бітве Аршанскай — моўчкі. Навошта
аб тым?
Паўсталі з кален каб — не трэба!
Не трэба нагод.
Заўсёды былі вы малодшыя
чыесьці браты,
Прыбіты, галодны, ушчэнт непісьменны
народ.
Прымайце ахвяраванні, вырабляйце тавар,
Хай гіне культура і ўсюды заводы
дымяць.
Хай кожны маскоўскі халуй — гэта ваш
гаспадар!
Ды толькі ці варта аб гэтым натхнёна
спяваць?
**РЭФРЭН:** Колькі год марылі,
Каб лясы і палі
Перайшлі пад Масквы ўладу.
Толькі тым і жылі,
У рэшце рэшт вы прыйшлі.
Дзякуй вам, дарагія браткі.
На месцы Аршанскае бітвы — ралля,
Забруджана рэчка Крапіўна, дзе вораг
тануў,
Па беразе рэчкі — дачы мясцовых
зямлян;
Аб бойні тае з іх ніхто і ніколі не чуў.

Чырвоная змена

# КРЫВАВАЕ ВОЗЕРА

## Легенда

**Яно двойчы мяняла сваё імя. З Жыцкага на Князь-возера, з Князь-возера на Чырвонае. Пра кожную з назваў гэтых складзены ў народзе паданні. Я раскажу аб апошнім імені возера, якое, хаця і ўзнікла ўжо ў савецкі час, бярэ вытокі ў далёкай слаўнай мінуўшчыне.**

Спытайцеся ў люду тамтэйшага, якой рыбай адорвае іх спакон веку возера? Адкажуць: краснапёрай. А пачырванела «пер'е» рыбінае быццам з крыві вялікай, што калісьці пралілася ў ваду ды насыціла зямлю далёка вакол возера.

А была тут калісьці бітва жорсткая, бой неміласэрны ўсё з тымі ж татарамі-душагубамі.

***

Як пры княжацкім двары ў дружыне храбрай служыў мужны воін сівавусы Пуцята. А ў таго ды Пуцяты раслі-выхоўваліся два сыны-волаты. Светлавокія, віхрастыя, смяшлівыя.

Радасна было бацьку, калі ў час пацешных боек з сынамі ўпэўніваўся ён у тым, што з цяжкасцю ўжо даюцца яму перамогі над юнакамі, што ў хуткім часе мацнейшымі, дужэйшымі за яго будуць хлопцы. У гонар любому бацьку такія сыны, і ганарыўся будучымі ратнікамі Пуцята, і дзякаваў Богу за шчасце, дараванае яму.

Сыны ж Пуцятавы, шаснаццацігадовыя дзецюкі, не думалі пакуль аб ратнай славе. З равеснікамі палявалі, спаборнічалі ў трапнасці, прывязваючы да пояса за хвасты забітых стралой вавёрак альбо балотных качак, з дзеўкамі карагоды вадзілі ў вяночках з дзьмухаўцоў, ды абодва, тайна адзін ад аднаго, спрабавалі падабацца румянай хуткавокай дзяўчыне з пяшчотным імем Каліна.

Але аднаго разу сівавусы Пуцята рашуча загадаў маладым волатам:

— Хопіць юнацкіх забаў! Час вам стаць сапраўднымі мужчынамі. Да князя пойдзеце разам са мною. Не адмовіцца, мыслю, слаўны ўладар ад такіх вояў. А там, як паход прыспее, пакажаце сябе так, каб бацьку не зганьбіць. Можа, і ўзвысіць вас за добрую службу князь.

Светлай раніцай перад вочы княжацкія прывёў святочна апранутых сыноў сваіх Пуцята. Але, мабыць, не ў час прыйшло сямейства волатаў у грыдніцу, бо толькі трывожны шэпт чаляднікаў, спалоханыя твары слуг ды сумны погляд князя, якім ён акінуў гасцей сваіх, сустрэлі іх.

— Ці бяда нечаканая падышла? Ці чума, мор чорны абрушыўся за грахі нашы на нас? — спытаўся сівавусы воін.

— Не мор, але не меншае зло, верны мой Пуцята, — адказаў князь, — злое семя ўзрасло цяпер замест хлеба на нашай няшчаснай зямлі. Дайшлі, урэшце, і да нас лютыя татары. Выпрабаванне дасылае нам Гасподзь. Учора бачылі ўжо за возерам Жыцкім паганых батыраў людзі нашы. І няма ім ліку, а ад капытоў іх коней уся трава на шляху воінства татарскага павытаптана, а ад смуроду нячыстых цел лістота на дрэвах згортваецца, вяне. Па пятах жа за касавокімі ліхадзеямі ляцяць крумкачы, бягуць ваўкі ненажэрныя. Адчуваюць пах смерці, бачна, па нас каркаюць, па нашых душах выюць...

Заклапочаным стаў твар Пуцяты. Будзе бойка крывавая!

— Ці сам павядзеш, княжа, дружыну на ворага? — спытаўся.

— Нягожа перакладваць мне свой крыж на плечы іншага,— з уздыхам адказаў князь.— Але ж табе, мой верны слуга, таксама будзе шмат клопату. Збярэш апалчэнне па навакольных вёсках. Бяры кожнага юнака, што дасягнуў шаснаццаці гадоў, кожнага старога, што трымаецца ў сядле. Іншага выратавання нам не бачу.

— Няхай будзе так,— цвёрда адказаў Пуцята.— Калі спатрэбіцца дружыне нашай, прыкрые яе з тылу апалчэнне нядужае. Тых жа, хто з іх памацней будзе, пастаўлю з левага боку ад асноўнага войска. Сам павяду іх на ворага, калі іншага наказу ад цябе, княжа, не будзе. Мяне ж у дружыне няхай замяняць сыны мае. Не адмаўляйся ад іх, мой гаспадар!

Шэрай раніцай на беразе возера сабраліся воіны княжацкія. І доўга стаялі яны ў цішы і ўглядаліся праз туман у той бок, адкуль павінны былі з'явіцца іх супраціўнікі. Але праз туман даносіліся толькі няясныя шолахі ды далёкае ржанне коней. Вось паступова пачаў разыходзіцца, таяць туман. І ўбачылі тады ратнікі варожае войска, якое на супраціўным баку возера таксама, як і яны, чакала, калі знікне туман.

І тады раздаўся воінскі кліч з аднаго боку ды дзікі віск — з другога. Па беразе возера ў напрамку адзін насустрач аднаму кінуліся воіны нашы ды татарскія.

І сышліся, і зазвінелі клінкі, і засвісталі стрэлы. І гарачай стала зямля для капытоў конскіх, і пачырванеў небасхіл не ад узыходзячага сонца, а ад крыві чалавечай.

Гэта быў час, калі знікае ў чалавеку ўсё людскае і, як дзікі драпежнік, толькі крыві прагне ён, ап'янелы бойкай.

Пуцята не бачыў у злой сечы сваіх сыноў, ён нават не думаў аб іх, адбіваючы ўдары, што сыпаліся на яго з усіх бакоў. Неўзабаве конь яго пачаў спатыкацца ў месіве чалавечых целаў. Тады Пуцята кінуў погляд далёка над галовамі ратнікаў, што біліся побач з ім. І з жахам убачыў, як сцягваюць з каня бяссільнага, паранёнага князя татары.

Застагнаў Пуцята, упэўніўшыся, што нічым не можа дапамагчы яму, акружаны з усіх бакоў ворагамі. Але нехта ўжо спяшаўся, прабіваючы сабе шлях мячом, да князя. І гэта быў адзін з сыноў Пуцяты. І паляцелі варожыя галовы з плеч пад ударамі рукі волата.

Але што гэта! Ззаду да асілка пад'язджае багата апрануты татарскі мурза, і падае-валіцца, як падсечаны малады дубок, з каня юнак.

А вакол стаіць немагчымы шум, ляск, крык, стогн. І скрозь рыданні б'е Пуцята ворагаў бязлітасна. І больш ужо не глядзіць у той бок, дзе загінуў сын яго, бо баіцца ўбачыць лёс другога, які таксама павінен быць недзе там. Але ўжо ляціць у сусвет шчырае бацькоўскае маленне: няхай хаця аднаго з дваіх пакіне яму Гасподзь у гэтай сечы!

І гарачымі сталі нават дзяржальні мячоў у руках воінаў. Тады не вытрымалі супраціўлення татары, кінуліся бегчы. І гналі іх некалькі вёрст па лясах і балотах ратнікі. І не было нікому з ворагаў выратавання.

Толькі пасля таго, як быў забіты апошні татарын, даведаўся Пуцята пра смерць і другога свайго сына. Яму ўдалося вынесці князя з поля бою, але сам юнак быў моцна паранены, ад ран гэтых і сканаў.

Глыбокія маршчынкі праляглі на лбе сівога Пуцяты, калі даведаўся ён пра гэта. І ў горы вялікім пакінуў стары воін паплечнікаў сваіх баявых. Пайшоў да возера глыбокага тугу сваю хвалям азёрным давяраць.

І застыў раптам у непаразуменні на высокім беразе. Чырвонай ад крыві праваслаўнай стала вада ў возеры. І было такое ўражанне, што возера змагалася таксама і зараз, параненае, сыходзіць крывёю...

З тых часін і пайшла ў возеры краснапёрая рыба.

Міналі гады. З часам Жыцкае возера начало называцца Князь-возерам. Новая назва існавала ажно да самай рэвалюцыі. А потым паўстала пытанне, ці варта яе захоўваць у краіне, дзе ўжо няма князёў. Памятаючы прыгожае паданне, сяляне навакольных вёсак прапанавалі назваць возера Чырвоным.

Назва спадабалася, бо адпавядала яна яшчэ і рэвалюцыйным настроям таго часу. Так Жыцкае возера, Князь-возера стала возерам Чырвоным.

А якой назвы яно больш заслугоўвае зараз, у час, калі многія старыя тапаграфічныя назвы вяртаюцца на карту рэспублікі,— вырашаць не нам.

Ірына **МАСЛЯНІЦЫНА.**



## Майстрыха

**Лепшай майстрыхай ручнога ткацтва і мастацкай вышыўкі па льняному палатну лічаць жыхары вёскі Шапялевічы Круглянскага раёна сваю аднавяскоўку, энергічную і заўзятую не па гадах, 76-гадовую Вольгу Пятроўну Палякову. Вытканыя ёю абрусы, пакрывалы, дарожкі-палавікі, вышытыя ручнікі і сурвэткі ўпрыгожваюць не толькі хату майстрыхі і кватэры яе дзяцей, але і экспазіцыі музеяў у Магілёве і Мінску, і выклікаюць заслужанае захапленне наведвальнікаў выставы беларускай народнай творчасці.**

Фота Івана **ЮДАША** **(БЕЛТА).**

# «Прадаецца жалейка!»




Праўленне Саюза музычных дзеячаў Беларусі, Асацыяцыя майстроў па стварэнню музычных інструментаў, якая сёння аб'ядноўвае 70 майстроў, правялі II выставу-продаж музычных інструментаў: смыковых, струнных, язычковых і ўдарна-шумавых.

Майстар! Гэта слова ахутана рамантыкай даўніны. У сваю работу майстар душу ўкладваў, паглядзіш на інструмент — а ён як жывы. Няшмат такіх майстроў засталося сёння. Вось і адшукваюць іх па ўсёй рэспубліцы, збіраюць, каб не згубіць апошняе, што захавалася. Бо з чым тады застанёмся!

А старыя майстры, яны вялікі вопыт маюць: і дрэва пада-браць, і гук пачуць. А таму і цаны няма іх работам. Вось, напрыклад, прадставіў І. Дударэвіч сваю скрыпку. Сціпла так: «Проста скрыпка». А даўней кожнаму інструменту, як чалавеку, імя давалі.

На аўкцыёне цікавая і сумная гісторыя здарылася. Скрыпку хацеў купіць хлопчык, ён з шасці гадоў іграе, у музычным ліцэі вучыцца, а інструмента не мае. Але яму не пашанцавала. Аўкцыён ёсць аўкцыён. Страсці разгарэліся, і купіў скрыпачку салідны чалавек з больш тоўстым кашальком.

На аўкцыён прыйшлі не толькі музыканты, але і работнікі музеяў, прадстаўнікі творчых калектываў, настаўнікі музычных школ, таму што вучыць таленавітых дзяцей трэба на інструментах, зробленых таленавітымі рукамі. Тады і вынік будзе бачны.

Ганна ХАРУЖАЯ.
Фота С. ГРЫЦА.









*Фота-рэпартаж*





14. Агата Крысці (Англія).

# Любоўны дэтэктыў

Была палавіна на восьмую. Ва ўтульным кабінеце Мелроўз з энтузіязмам вопытнага паляўнічага расказваў аб падзеях мінулай зімы. Містэр Сатэрфвейт слухаў яго з нязменнай ветлівасцю.

Рэзкі тэлефонны званок перапыніў аповед Мелроўза. Ён падышоў да стала і зняў тэлефонную трубку.

— Добра, Кэрціс. Я выязджаю зараз жа.— Апусціў трубку і павярнуўся да госця:— Сэра Джэймса Двайтана знайшлі забітым у яго кабінеце. Я павінен неадкладна ехаць у Олдэрвейт. Хочаце паехаць са мной?

Містэр Сатэрфвейт успомніў, што палкоўнік быў галоўным канстэблем графства.

— Калі я не буду перашкаджаць...

Праз пяць хвілін містэр Сатэрфвейт сядзеў у машыне разам з палкоўнікам. Яны праехалі амаль паўтары мілі, калі Мелроўз нарэшце загаварыў:"Вы іх, думаю, ведаеце?"

— Двайтанаў? Вядома, я ведаю іх.

— Прыемная жанчына лэдзі Двайтан,— сказаў палкоўнік.

— Прыгожая!— пераканана адказаў Сатэрфвейт.— Ярка выражаны тып італьянскага Адраджэння. Яе лёгка ўявіць у палацы дожа або ў ролі Лукрэцыі Борджыа.

Палкоўнік накіраваў машыну ўбок, і містэр Сатэрфвейт змоўк.

— Двайтан не атручаны?— нечакана спытаў ён.

— Не, не атручаны,— хмура прагаварыў Мелроўз.— Яго стукнулі па галаве бронзавай статуэткай. Паслухайце, Сатэрфвейт, ці ведаеце вы штонебудзь пра чалавека па прозвішчу Пол Дэлангуа?

— Хіба Пол зараз у гэтых мясцінах?

— Ён гасціў у Олдэрвейце ў Двайтанаў. Ходзяць чуткі, што сэр Двайтан выкінуў яго адтуль тыдзень таму.

— Чаму?

— Думаю, застаў яго са сваёй жонкай. Якога д'ябла...

Іх моцна занесла, потым пачуўся штуршок і скрыгатанне.

— У Англіі скрыжаванні заўсёды небяспечныя, але ўсё ж гэтаму хлопцу варта было б даць сігнал. Бо па галоўнай магістралі ехалі мы,— прагаварыў Мелроўз і выскачыў з машыны. З другой таксама паказалася нейкая фігура і далучылася да палкоўніка.

— Поўнасцю мая віна,— прагаварыў незнаёмец.— Я дрэнна ведаю гэту мясцовасць...

Містэр Сатэрфвейт, вельмі ўзбуджаны, выскачыў з машыны і энергічна схапіў незнаёмца за руку.

— Гэта вы! Якое супадзенне!

— О!— выгукнуў палкоўнік.

— Містэр Харлі Квін, я ўпэўнены, што не раз гаварыў вам пра містэра Квіна.

Містэра Сатэрфвейта прама распірала ад узбуджэння.

— Не!— усклікнуў ён.— Не, як я адразу не здагадаўся! Калі справа датычыцца вас, містэр Квін, выпадковасцей не бывае. Непроста так мы сустрэліся на гэтым скрыжаванні.

Палкоўнік Мелроўз глядзеў на сябра са здзіўленнем. Містэр Сатэрфвейт узяў яго пад руку.

— Вы памятаеце, я расказваў пра нашага знаёмага Дэрэка Капеле? Ніхто не мог здагадацца аб прычынах яго самазабойства. А менавіта ж містэр Квін вырашыў гэту праблему.

— Мой дарагі Сатэрфвейт, вы прымушаеце мяне чырванець,— прагаварыў, усміхаючыся, містэр Квін.

— Нам нельга больш марнаваць час. Едзем.— Палкоўнік Мелроўз няёмка адкашляўся і сеў на вадзіцельскае месца.

— Дык вы цікавіцеся злачынствамі, містэр Квін?— спытаў палкоўнік,вельмі стараючыся быць сардэчным.

— Я думаю,— павольна сказаў містэр Сатэрфвейт,— мне здаецца, містэр Квін цікавіцца закаханымі.

— Бог мой!— выгукнуў уражаны палкоўнік і змоўк.

Яны павярнулі да варот сядзібы,— і машына спынілася ля дарожкі,што вяла да галоўнага ўвахода.

Яны прайшлі ў кабінет, які служыў і бібліятэкай. Тут іх пачціва сустрэў інспектар Кэрціс, на выгляд тыповы служака.

— Страшная справа, сэр. Чалавека ўдарылі ззаду, зверху ўніз, страшны ўдар, які разламаў чэрап. Прылада злачынства ляжала на падлозе — бронзавая фігурка каля двух футаў вышынёй. Вокны былі зачынены знутры.

Інспектар шматзначна замоўк.

Забіты быў апрануты ў касцюм для гольфа, спартыўная сумка з клюшкамі была неахайна кінута на вялікую скураную кушэтку.

— Толькі што з пляцоўкі для гольфа,— растлумачыў інспектар.— Гэта было ў 17.15. Лакей прынёс яму чай сюды. Пазней ён пазваніў, каб камердынер прынёс яму хатнія туфлі.

Мелроўз кіўнуў і звярнуў увагу на пісьмовы стол. У першую чаргу кідаўся ў вочы вялікі, упрыгожаны эмаллю гадзіннік, які ляжаў на баку ў самым цэнтры стала.

Інспектар пракашляўся.

— Гэта можна назваць удачай, сэр. Як бачыце, яны спыніліся, што ўказвае на час злачынства.

Палкоўнік не адводзіў позірку ад гадзінніка.

— Гэта мне зусім не падабаецца, інспектар.

— Вы хочаце сказаць, што гадзіннік не мог так упасці?

Палкоўнік асцярожна паставіў гадзіннік на падстаўку і моцна стукнуў па стале. Гадзіннік завагаўся, але ўстаяў.

— Калі было выяўлена злачынства?— рэзка спытаў Мелроўз.

— Якраз каля сямі, сэр.

— Хто яго выявіў?

— Дварэцкі.

— Паклічце яго сюды. Я хачу з ім сустрэцца. А дзе, дарэчы, лэдзі Двайтан?

— Яна лягла, сэр. Пакаёўка гаворыць, што яна вельмі дрэнна сябе адчувае і не можа нікога бачыць.

Інспектар пайшоў на пошукі дварэцкага. Містэр Квін задуменна глядзеў у камін, містэр Сатэрфвейт займаўся тым жа. Раптам ён нахіліўся і падабраў маленькі асколак выпуклага шкла, які зачапіўся за камінную рашотку.

— Вы хацелі мяне бачыць, сэр?

Гэта быў голас дварэцкага.

— Сядайце,— мякка прагаварыў палкоўнік.— Я разумею, якім гэта было ўдарам. Ваш гаспадар, напэўна, прыйшоў у пяць?

— Ён распарадзіўся, каб чай яму прынеслі сюды. Калі я прыйшоў забраць паднос, ён папрасіў, каб я прыслаў яму Джэнгіса — гэта камердынер, сэр.Я перадаў Джэнігсу. Калі я прыйшоў сюды ў сем гадзін, каб зачыніць вокны і завесіць парцьеры, толькі тады я ўбачыў...

— Вы не бачылі гаспадыню ў гэты вечар?

— Я... я бачыў яе мімаходзь, сэр, калі яна спускалася па лесвіцы.

— Калі гэта было?

— Каля палавіны на сёмую, сэр.

Мелроўз набраў у лёгкія больш паветра і сказаў:

— Хопіць, дзякуй вам. Калі ласка,прышліце да мяне Джэнігса.

У Джэнігсе была нейкая непранікальнасць і скрытнасць. Містэр Сатэрфвейт падумаў, што такі чалавек мог забіць свайго гаспадара, калі б быў упэўнены, што не будзе выкрыты. Тое, што ён гаварыў, гучала зусім пераканаўча: ён прынёс гаспадару мяккія хатнія туфлі і забраў спартыўныя.

— Што вы рабілі пасля гэтага, Джэнінгс?

— Вярнуўся ў камердынерскую, сэр.

Палкоўнік Мелроўз кіўком галавы адпусціў камердынера, гледзячы запытальна на Кэрціса.

— Усё правільна, сэр. Я правяраў. Ён сапраўды знаходзіўся ў камердынерскай з шасці дваццаці да сямі гадзін.

— Значыць, яго падазраваць нельга,— заўважыў з жалем Мелроўз.— Акрамя таго, адсутнічае матыў.

Пачуўся стук у дзверы.

— Заходзьце,— сказаў палкоўнік.

Паказаўся спалоханы тварык пакаёўкі.

— Прабачце, лэдзі даведалася, што палкоўнік Мелроўз тут і хацела б яго бачыць.

Нечая рука адсунула дзяўчыну ўбок, і ў дзвярах з'явілася сама лэдзі Двайтан, падобная на прышэліцу з іншага свету.

— Я прыйшла, каб сказаць вам... сказаць вам...

Голас у яе быў глыбокі і зычны. Містэр Сатэрфвейт быў захоплены драматызмам гэтай сцэны.

— Я забіла яго. Менавіта гэта я і прыйшла сказаць. Настала мінута напружанай цішыні.

— Лэдзі Двайтан,— прагаварыў нарэшце Мелроўз,— у вас моцны шок, гэта ад перанапружання. Я не ўпэўнены, што вы поўнасцю ўсведамляеце, пра што гаворыце.

— Як вы не разумееце? Я спусцілася ўніз і застрэліла яго.

Кніга, якую яна трымала ў руцэ, упала на падлогу. У ёй быў нож для разразання паперы ў форме кінжала з аздобленай каштоўнымі каменьчыкамі ручкай. Містэр Сатэрфвейт аўтаматычна падняў яго і паклаў на стол.

— Дык што ж,— у голасе лэдзі Двайтан прагучала напружанне,— што вы збіраецеся рабіць далей?

Палкоўнік Мелроўз з цяжкасцю вымавіў:

— Усё, што вы сказалі, лэдзі Двайтан, вельмі сур'ёзна. Я павінен прасіць вас вярнуцца ў ваш пакой, пакуль я... не зраблю распараджэнняў...

Нечакана раздаўся голас містэра Квіна:

— Што вы зрабілі з рэвальверам, лэдзі Двайтан?

На яе твары мільганула імгненная няўпэўненасць.

— Я не магу ўспомніць. Якое ўсё гэта мае значэнне?

Лэдзі Двайтан горда ўскінула галаву і выйшла з пакоя. Містэр Сатэрфвейт паспяшаўся за ёй. Унізе ля лесвіцы стаяла спалоханая пакаёўка.

— Сэр, скажыце, калі ласка, яны ж не падазраюць яго, праўда?

— Падазраюць каго?

— Джэнінгса, сэр. Паверце, ён не пакрыўдзіць і мухі!

— Джэнінгса? Не, вядома, не. Ідзіце і паклапаціцеся аб гаспадыні.

Дзяўчына хутка пабегла па лесвіцы, а містэр Сатэрфвейт вярнуўся ў пакой.

У поўнай цішыні да іх вушэй данёсся нейкі гук.

— Падобна на выстрал,— сказаў палкоўнік.— Напэўна, гэта хтосьці з вартаўнікоў. Гэтыя гукі яна, напэўна, і чула. Можа, нават спускалася ўніз і вырашыла...

— Містэр Дэлангуа, сэр.— У дзвярах стаяў дварэцкі.

— Прасіце яго,— хмура сказаў палкоўнік, адкінуўшыся на спінку крэсла.

Праз мінуту Поль Дэлангуа ўжо стаяў у дзвярах. Мяккая грацыя рухаў, смуглы прыгожы твар, вельмі блізка пасаджаныя вочы.

— Добры вечар, джэнтльмены,— сказаў Дэлангуа, суправаджаючы прывітанне крыху тэатральным паклонам.— Я прыйшоў сюды, каб прызнацца ў забойстве сэра Джэймса Двайтана.

Вочы маладога чалавека былі звернуты на стол.

— Чаму я прызнаюся? Назавіце гэта пакаяннем... чым хочаце. Я закалоў на смерць, у гэтым можаце быць зусім упэўненымі.— Ён кіўнуў у напрамку стала.— Я бачу, вы знайшлі зброю. Вельмі зручны інструмент. На жаль, лэдзі Двайтан пакінула яго ў кнізе, і я яго выкарыстаў...

— І калі гэта здарылася?

Дэлангуа завагаўся.

— Дайце падумаць. Я размаўляў з кімсьці з вартаўнікоў каля чвэрці сёмай. Я чуў, як прабіў царкоўны гадзіннік. Значыць, адбылося ўсё ў палове на сёмую.

На губах палкоўніка з'явілася хмурая ўсмешка.

— Вы маеце рацыю, малады чалавек,— прагаварыў ён.— Менавіта а палове на сёмую. І, павінен заўважыць, гэта зусім асаблівае забойства.

— Чаму?

— Надта ж шмат людзей прызнаюцца ў ім.

— Лэдзі Двайтан прызналася, што застрэліла сэра Джэймса, а вы — што закалолі яго. На шчасце для вас абаіх, ён не быў заколаты або застрэлены. Яму разбілі галаву.

— Бог мой!— усклікнуў Дэлангуа.— Жанчына не можа зрабіць гэтага!..

Ён змоўк і прыкусіў губу. Мелроуз кіўнуў з ледзь прыкметнай усмешкай.

— Часта чытаў пра такое, але ніколі не сустракаўся ў жыцці.

— Пра што вы?

— Пра пару маладых ідыётаў, кожны з якіх бярэ віну на сябе толькі таму, што думае, быццам злачынства ўчыніў другі.

— Камердынер!— усклікнуў містэр Сатэрфвейт.— Гэта дзяўчына толькі што... я проста не звярнуў увагі... Яна баялася, што мы падазраём Джэнінгса. У яго павінен быць матыў, пра які нам невядома, але вядома пакаёўцы.

Палкоўнік Мелроўз нахмурыўся, потым пазваніў:"Спытайце ў лэдзі Двайтан, ці добра яна сябе адчувае, каб спусціцца яшчэ раз уніз?"

Усе моўчкі чакалі прыходу лэдзі. Убачыўшы Дэлангуа, яна здрыганулася і абапёрлася аб нешта рукой, каб не ўпасці.

Палкоўнік Мелроўз пракашляўся.

— Калі дазволіце мне сказаць, лэдзі Двайтан, вам абодвум пашанцавала.Дэлангуа з'явіўся якраз затым, каб у сваю чаргу,"прызнацца" ў забойстве. Але не хвалюйцеся, усё ў парадку — ён яго не ўчыняў. Аднак нам трэба ведаць праўду. Хопіць усёй гэтай бязглуздзіцы. Дварэцкі сказаў, што вы ўваходзілі ў кабінет а палове на сёмую, так?

— Я скажу,— уздыхнула лэдзі Двайтан і апусцілася ў крэсла, якое паспешліва падсунуў містэр Сатэрфвейт.— Я сапраўды спускалася ўніз. Адчыніла дзверы кабінета і ўбачыла... О божухна!— Яна закрыла твар рукамі.

— Прабачце мне, лэдзі Двайтан. Вы падумалі, што містэр Дэлангуа застрэліў яго?

Яна кіўнула.

— Прабачце мне, Поль,— умольна сказала Лаўра,— але вы ж казалі... казалі...

— Што прыстрэлю яго, як сабаку,— хмура прагаварыў Дэлангуа.— Я памятаю. Гэта было ў той дзень, калі я даведаўся, што ён дрэнна паводзіць сябе з вамі.

— Значыць, у шэсць дваццаць пяць сэр Джэймс быў ужо мёртвы? Выходзіць, гэты гадзіннік хітрасць? Гэты факт, напэўна, звужае кола да дварэцкага і камердынера, але я не веру, што гэта быў дварэцкі. Скажыце, лэдзі Двайтан, Джэнінгс меў зуб супраць вашага мужа?

— Не тое, што зуб,— Лаўра падняла галаву,— але толькі сёння Джэймс сказаў мне, што звольніў Джэнінгса.

—А! Вось яно! Джэнінгс страціў бы работу і не атрымаў рэкамендацый. Для яго гэта вельмі сур'ёзна.

— Вы нешта сказалі пра гадзіннік,— сказала Лаўра Двайтан.— Ёсць магчымасць даведацца пра дакладны час — у Джэймса напэўна быў залаты гадзіннік, ён звычайна браў яго з сабой на гольф.

Інспектар з разуменнем кіўнуў і выйшаў з пакоя. Праз мінуту ён вярнуўся, трымаючы на выцягнутай далоні невялікі гадзіннік у форме мяча для гольфа.

— Вось ён, сэр.

Палкоўнік узяў гадзіннік, націснуў пальцам— і крышка гадзінніка адчынілася. Унутры шкло было разбіта.Стрэлкі паказвалі чвэрць сёмай.

Добры партвейн, палкоўнік Мелроўз,— сказаў містэр Квін.

А палоаве на дзевятую закончылася вячэра ў доме палкоўніка. Містэр Сатэрфвейт быў проста ў захапленні.

— Я меў рацыю, вы не можаце адмаўляць, містэр Квін. Вы сустрэліся нам, каб ратаваць двух неразумных маладых людзей, якія так неразважліва сунулі галовы ў пастку.

— Хіба?— запярэчыў містэр Квін.— Я нічога не зрабіў.

— Проста не было неабходнасці,— згадзіўся містэр Сатэрфвейт.— Ніколі не забуду моманту, калі лэдзі Двайтан сказала:"Я забіла яго!"

— Іх учынкі быццам узяты з рамана,— сказаў палкоўнік.

— Асмелюся меркаваць, што менавіта адтуль яны ўзялі гэтую ідэю,— заўважыў містэр Квін.

— Магчыма,— згадзіўся Сатэрфвейт.

— Стрэлкі перавялі наперад, мы гэта ведаем,— прамовіў містэр Сатэрфвейт.

— Вось як?— здзівіўся містэр Квін.

— Ці не хочаце вы сказаць, што перавялі назад гадзіннік для гольфа? Бяздумна і немагчыма.

— Зусім не немагчыма,— прамурлыкаў містэр Квін.

— Але каму гэта патрэбна?

— Я думаю, толькі таму, у каго на гэты час было алібі.

— Божа мой!— усклікнуў палкоўнік.—Дэлангуа сказаў, што менавіта ў гэты час размаўляў з вартаўніком.

— Спецыяльна сказаў,— заўважыў містэр Сатэрфвейт.

— Але ў такім выпадку,— пачаў Мелроўз,— у такім выпадку...

Містэр Сатэрфвейт закончыў за яго:

— Усё зусім наадварот. Гэта змова, але змова супраць камердынера. Але такога не можа быць! Яны ж хацелі ўзяць віну на сябе!

— Так,— сказаў містэр Квін.— Вы ж падазравалі іх?— Голас яго гучаў спакойна і нават ледзь летуценна.— А для таго, каб ім паверылі, трэба было прыдумаць нешта праўдападобнае.

Палкоўнік і містэр Сатэрфвейт глядзелі на Квіна з бездапаможным выглядам.

— Гэта было б вельмі разумна,— павольна пачаў містэр Сатэрфвейт.— Проста вельмі разумна. Вось, што яшчэ прыйшло мне ў галаву. Дварэцкі ж сказаў, што ўвайшоў у сем гадзін зачыніць вокны — значыць, ён думаў, што вокны павінны быць адчынены.

— Менавіта гэтым шляхам Дэлангуа і трапіў у дом,— сказаў містэр Квін.— Ён забіў містэра Джэймса адным ударам, і яны абодва зрабілі ўсё, што ім было патрэбна...

Ён глянуў на містэра Сатэрфвейта, быццам запрашаючы яго аднавіць сцэну. Той няўпэўнена пачаў:

— Яны разбілі гадзіннік і паклалі цыферблатам уверх. Так, яны перавялі стрэлкі гадзінніка для гольфа, папярэдне разбіўшы шкло. Потым Дэлангуа выбраўся з дома, а лэдзі Двайтан зачыніла вокны.

— Я поўнасцю памыляўся,— паківаў галавой містэр Сатэрфвейт.— Я думаў, што містэр Квін прыехаў ратаваць іх.

— Я і ратаваў,— адказаў містэр Квін.— Але не тых дваіх, зусім іншых. Можа вы звярнулі ўвагу на пакаёўку лэдзі? Вядома, яна не апранута ў сінюю парчу і не выконвала драматычнай ролі ў гэтым спектаклі. Але яна сапраўды добрая дзяўчына і, думаю, кахае гэтага Джэнінгса. Так што вы зможаце ратаваць яго ад шыбеніцы.

— У нас няма ніводнага доказу,— хмура сказаў палкоўнік Мелроўз.

— У містэра Сатэрфвейта ёсць доказ, што гэты гадзіннік разбіўся не ў кішэні сэра Джэймса. Іх немагчыма разбіць, не адчыніўшы крышкі. Хтосьці выняў гадзіннік, адчыніў, перавёў стрэлкі, разбіў шкло, потым зачыніў і паклаў назад. Яны так і не заўважылі, што не хапае маленькага асколка.

—О!— усклікнуў містэр Сатэрфвейт. Яго рука сама пацягнулася да кішэні камізэлькі. Ён выняў асколак крыху сагнутага шкла.

**Пераклад М.Кулаковіч.**

**Старонку вядзе П.Сіманаў.**

